## Другая палавіна тыдня будзе халаднаватая і з дажджамі

**На надвор'е ў Беларусі ў пачатку тыдня аказвае ўплыў вобласць павышанага ціску, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга ФЯДОТАВА.**

Сёння днём пераважна без ападкаў. Раніцай месцамі згусціцца туман. Тэмпература паветра будзе вагацца ад 9 да 15 градусаў цяпла.

Сухое надвор'е захаваецца ў сераду. Толькі ўдзень на паўночным захадзе атмасферны фронт прынясе непацяглыя дажджы. Тэмпературны фон у начны час істотна не зменіцца, а ўдзень паветра прагрэецца да 10—17 градусаў. Раніцай у нізінах магчымы туман. Па меры перамяшчэння атмасфернага фронту на ўсход дажджы ў чацвер пройдуць у многіх раёнах Беларусі. У начны час тэмпература паветра істотна не зменіцца і складзе 4—9 градусаў цяпла. Удзень стане халадней — ад 6 да 12 градусаў цяпла.

У пятніцу, 24 кастрычніка, кароткачасовыя дажджы чакаюцца толькі на ўсходзе краіны. У начны час тэмпература паветра складзе 1—7 градусаў цяпла, у асобных раёнах чакаюцца замаразкі да нуля — мінус 2 градусаў. Удзень тэмпература паветра застанецца ў ранейшых межах — 6—12 градусаў цяпла.

**БЕЛТА.**


*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**21** КАСТРЫЧНІКА 2008 г.
АЎТОРАК
№ 199 (26312)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ РОБІЦЦА ШМАТ ДЛЯ ТАГО, КАБ УМАЦАВАЦЬ ПРЫНЦЫПЫ ГУМАНІЗМУ І ДОБРАЙ ВОЛІ»

**На працягу ўжо многіх гадоў 21—23 кастрычніка адзначаецца сумная дата ў гісторыі народа Беларусі — дні знішчэння ў 1943 годзе Мінскага гета. Мінскае гета, створанае гітлераўцамі ў 1941 годзе, было адным з найбуйнейшых у Еўропе: тут загінулі 100 тысяч чалавек. Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўзяў удзел у цырымоніі ўскладання вянкоў на мемарыяльным комплексе «Яма» ў памяць 65-годдзя трагедыі Мінскага гета.**

Выступаючы на гэтым жырботным месцы, кіраўнік краіны зазначыў, што ў такія сумныя хвіліны кожны павінен з асаблівай выразнасцю ўсвядоміць, што азначаюць для цывілізацыі і для кожнага ўзятага асобна чалавечага жыцця вар'яцкія «расавыя тэорыі», міжнародны тэрарызм, ксенафобія, нацыяналізм, узведзеныя ў ранг ідэалогіі, філасофіі і палітыкі. «Нас заўсёды выручалі яднанне і ўзаемадапамога, сапраўдны інтэрнацыяналізм і натуральная чалавечая высакароднасць. У сучаснай Беларусі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, — робіцца шмат для таго, каб умацаваць прынцыпы гуманізму і добрай волі. Мы свята шануем памяць усіх, хто змагаўся з фашызмам».

«Нельга забываць, што гітлераўцы асуджалі на смерць мільёны людзей розных нацыянальнасцяў. Беларускіх яўрэяў уцалела маленькая жменька, іх забілі толькі за тое, што яны былі народжаны яўрэямі», — сказаў Прэзідэнт. Звяртаючыся да былых вязняў гета, якія прысутнічалі на цырымоніі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ён і ўвесь беларускі народ падзяляе іх бязмежнае гора — страту родных і блізкіх. І зазначыў, што «ніколі больш не павінны паўтарыцца вар'яцтвы фашыстаў, ніколі не павінны браць верх ідэі ксенафобіі і нацыянальнай несправядлівасці».

Аляксандр Лукашэнка паведаміў на цырымоніі пра тое, што прынята рашэнне аб стварэнні ў Трасцянцы, дзе знаходзіўся адзін з найбуйнейшых у свеце лагераў смерці «Трасцянец», велічнага мемарыяла Памяці. «У яго стварэнні, — выказаў упэўненасць кіраўнік краіны, — возьмуць удзел не толькі беларусы, але і валанцёры з усяго свету, усе, каму дарагі гуманізм, хто лічыць сябе сапраўдным антыфашыстам. Гэта будзе сапраўдны агульнаеўрапейскі помнік — даніна павагі тым пакаленням, на якія абрынуліся ўсе цяжкасці і выпрабаванні XX стагоддзя». Паводле слоў Прэзідэнта, «наш святы дэвіз «Нішто не забыта, ніхто не забыты!» Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, мы ў вялікім даўгу перад памяццю франтавых байцоў, падпольшчыкаў і ахвяраў нацызму.

Больш падрабязна пра стварэнне мемарыяла Памяці ў Трасцянцы Прэзідэнт расказаў журналістам, адказваючы на пытанні. У прыватнасці, ён адзначыў, што ўзвядзенне новага манумента вельмі важна з пункту гледжання таго, што нельга забываць аб гэтых трагічных падзеях: калі мы іх забудзем, то яны могуць паўтарыцца. «У Трасцянцы мы зробім добры, жыццёвы, народны, пазбаўлены празмернай пампезнасці, але велічны помнік», — сказаў Прэзідэнт. Між іншым, ужо было прадстаўлена 14 праектаў манумента, аднак ні адна з прапаноў не прынята. А таму конкурс будзе праведзены паўторна. «Мы будзем гэта рабіць, каб наступныя пакаленні не забывалі пра тое, што адбывалася ў сярэдзіне мінулага стагоддзя», падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Каментуючы рашэнне Еўрасаюза аб частковым зняцці санкцый у дачыненні да нашай краіны і перспектывы далейшага ўзаемадзеяння з ЕС, Прэзідэнт назваў апошнія вельмі добрымі. Па яго словах, для дыялогу з Еўрасаюзам перашкоды зняты. «Прынамсі, галоўны вынік у тым, што мы можам мець стасункі з Еўропай не праз «жалезную заслону». Гэта дарагога каштуе, пагадзіцеся», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Еўропа, — заўважыў Прэзідэнт, — зрабіла няхай маленькі крок ці паўкроку, але ён вельмі значны. Мы ў гэтым напрамку будзем рабіць шмат крокаў. Мы абавязкова прыйдзем да разумення з еўрапейцамі, што жывём у адным доме, і што сэрца гэтага дома тут, у Беларусі. Мабыць, еўрапейцы гэта разумеюць». Прэзідэнт адзначыў і тое, што ў Беларусі высока цэняць зробленыя Еўропай крокі, таму што зрабіць іх было няпроста. «У ЕС 27 краін і кожная магла б заблакаваць гэтае рашэнне. Былі такія дзяржавы. Але яны адступілі ад сваёй пазіцыі. Я гэта вельмі цаню, і, мяркую, у нас вельмі добрыя перспектывы ва ўзаемаадносінах з Еўропай», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Між іншым, гаворачы пра ўзаемаадносіны з ЕС і з Расіяй, кіраўнік Беларусі заявіў, што для нашай краіны яны ў роўнай ступені важныя. І нагадаў, што Беларусь праводзіць шматвектарную палітыку. «Мы ў цэнтры Еўропы — і гэтым усё сказана, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Таму для нас важная Еўропа. А з рускімі мы — адзін народ».

Зрэшты, што датычыцца Расіі, то паводле меркавання беларускага лідара, у інтэграцыйных працэсах на прасторы СНД ад гэтай краіны залежыць шмат, дакладней, ад пазіцыі РФ. Прэзідэнт лічыць, што Расія, як цэнтр, павінна прыняць на сябе ролю каталізатара інтэграцыйнага працэсу. «Зразумела, што эканамічнае супрацоўніцтва, зняцце ўсіх бар'ераў у адносінах з дзяржавамі нам вельмі выгаднае. Што ж перашкаджае? — запытаўся Аляксандр Лукашэнка. — Быццам бы нічога. Перад журналістамі ўсе гавораць, што гэта трэба рабіць». Калі ж даходзіць да справы, заўважыў Прэзідэнт, да канкрэтных рашэнняў, то высвятляецца, што камусьці гэтае супрацоўніцтва шкодзіць. На яго погляд, тое, што з СНД з лёгкасцю сышла тая ж Грузія, тлумачыцца наступным: у Садружнасці яе фактычна нічога не трымала. «А неабходна зрабіць так, — лічыць Прэзідэнт, — каб нас шмат што трымала ў СНД і ЕўрАзЭС». І залежыць гэта, перш за ўсё, ад Расіі.

Адказваючы на пытанне ізраільскага журналіста аб дзейнасці апазіцыі ў Беларусі, Прэзідэнт патлумачыў, што «патрэбны час, каб у краіне сфарміравалася нармальная апазіцыя, якая б выказвала інтарэсы народа, — патрыятычная, а не амерыканская, нямецкая ці англійская апазіцыя». Ён падкрэсліў, што прыйшоў у прэзідэнцкае крэсла не з улады, а быў да гэтага канструктыўным апазіцыянерам. Дарэчы, лідары сучаснай апазіцыі, адзначыў Прэзідэнт, пачыналі разам з ім, але «потым ім партфелі паказаліся не тыя, і яны вырашылі сысці ў апазіцыю». Сёння, паводле яго слоў, апазіцыянераў турбуе тое, што з'явіліся перспектывы паспяховага развіцця адносінаў з ЕС, што краіне становіцца лепш, а ім хацелася б, каб было горш. «І на гэтым яны хочуць прыйсці да ўлады, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Аднак так не атрымаецца. Вось у чым праблема сучаснай беларускай апазіцыі».

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

### *ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ! ПАВАЖАНЫЯ ЗАМЕЖНЫЯ ГОСЦІ!*

*65 гадоў таму ў акупаваным Мінску фашысцкія карнікі знішчылі апошніх вязняў Мінскага гета. Гэта журботная дата нагадвае пра цяжкія выпрабаванні, якія выпалі на лёс нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.*

*У гэты суровы і трагічны перыяд Беларусь панесла незаменныя страты. Кожны трэці загінуў на франтах і ў партызанскіх атрадах, быў закатаваны ў канцлагерах і турмах. На шматпакутнай беларускай зямлі нацысты арганізавалі гета, дзе асуджаных вязняў чакала немінучая смерць. Мінскае гета было адным з самых буйных у Еўропе. Тут знішчаліся не толькі жыхары нашай краіны, але і грамадзяне Германіі, Аўстрыі, Польшчы, іншых дзяржаў.*

*Уся Беларусь успрыняла гора яўрэйскага народа як сваю бяду. З рызыкай для жыцця беларусы ратавалі ад немінучай гібелі многіх яўрэяў, дарослых і дзяцей. За праяўленую высакароднасць і гераізм амаль 700 грамадзян нашай рэспублікі ўдастоены высокага звання «Праведнік народаў свету».*

*Вязні Мінскага гета, як і іншых лагераў смерці, не схілілі галаву перад катамі. За калючым дротам яны стваралі баявыя падпольныя групы. Многія маладыя людзі змаглі ўцячы з нявол і ўліцца ў рады партызанаў, дзе храбра і годна змагаліся з ворагам.*

*Журботная гадавіна знішчэння Мінскага гета болем адклікаецца ў нашых сэрцах. У імя памяці ахвяраў гітлераўскага генацыду неабходна зрабіць усё, каб не паўтарыліся тыя страшныя падзеі. Мы напоўнены рашучасцю супрацьстаяць любым праявам нацызму і рэлігійнай нецярпімасці. Няхай мірная і цудоўная Беларусь заўсёды будзе нашым агульным, родным і ўтульным домам.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА**

### Прэзідэнт Беларусі павіншаваў генеральнага сакратара АДКБ М. Бардзюжу з днём нараджэння

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў генеральнага сакратара Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Мікалая Бардзюжу з днём нараджэння.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

### Мітрапаліт Філарэт і Патрыярх Алексій II узнагароджаны ордэнам Пашаны

За значны асабісты ўклад у духоўнае адраджэнне беларускага народа, умацаванне дружбы і культурных сувязяў паміж народамі Беларусі і Расіі ордэнам Пашаны ўзнагароджаны Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II і Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Адпаведны ўказ 20 кастрычніка падпісаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.




*Жыхар вёскі Леніна Жыткавіцкага раёна Іван СТАХІЕВІЧ — бацька шматдзетнай сям'і, у яго сем сыноў і дачка. Уласнымі сіламі гэтая сям'я робіць прыбудову да свайго дома.*

## «ШТО Ў ВАС ДОБРАГА?»




**Святлана ГАРАДЗЕЦКАЯ, галоўны бібліятэкар філіяла № 14 Брэсцкай гарадской бібліятэкі:** самае добрае, што літаральна тыдзень таму ў мікрараёне Кавалёва Брэста адкрылася новая бібліятэка. Мы атрымалі светлы ўтульны вялікі пакой для размяшчэння фонду. З рамонтам паспрыяў калектыў ЖЭС-11. Мэблю дапамагла купіць прадпрымальнік Наталля Ільніцкая, прама падчас адкрыцця нам падарылі шмат патрэбнай літаратуры, кнігамі падзяліліся розныя ўстановы, буйныя бібліятэкі горада. Кніжкі прыносяць у падарунак таксама многія наведвальнікі. За тыдзень да нас запісаліся каля 200 чытачоў, большасць з іх — школьнікі, навучэнцы, студэнты.

На невялікім мерапрыемстве з нагоды адкрыцця нехта з гасцей сказаў, што апошнім часам нярэдка чуваць, як закрываюцца сельскія чытальні, тым больш прыемнай выглядае навіна пра стварэнне новай бібліятэкі. І нягледзячы на пагалоўную «інтэрнэтызацыю», на шчасце, шмат людзей мае патрэбу прачытаць кніжку, пагартаць перыёдыку.

**Анатоль ГЛАДЫШЧУК, загадчык кафедры фізікі Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта, аматар і знаўца брэсцкай гісторыі:** мы, здаецца, знайшлі сімвал старажытнага Бярэсця — брэсцкую ратушу. Спачатку мы з калегамі вылічылі яе на камп'ютары, калі сумясцілі старадаўнія карты горада з сучаснымі касмічнымі здымкамі. А днямі мінскія спецыялісты правялі даследаванне з дапамогай спецыяльнага прыбора — геарадара, які па прынцыпе радыёлакацыі «прасвятляе» тоўшчу зямлі на некалькі метраў. Прыбор зафіксаваў фрагменты сцяны прыкладна ў два метры глыбінёй недалёка ад адной з казармаў Брэсцкай крэпасці. Далейшае пакажуць раскопкі.

Дарэчы, выкарыстоўваючы той жа метад, што і пры вылічэнні ратушы, я, магчыма, знайшоў месца адной з абарончых вежаў Берасцейскага замка. Геарадар таксама паказаў фрагмент кладкі дугападобнай формы. Версія мае патрэбу ў археалагічным пацвярджэнні. Але і тое, што зроблена — вялікі крок да дастойнага ўшанавання гісторыі старажытнага Брэста.

**Алена ХАЦЬКО, намеснік старшыні Брэсцкага абласнога суда:** Што добрага?.. За патокам паўсядзённых праблем, якія разглядае суддзя па грамадзянскіх справах, часам можа здацца, што жыццё складаецца спрэс з цяжбаў, прэтэнзій, людскіх драмаў. Але ўсё ж здараюцца праблескі. Вось і не так даўно разглядалася справа па дзяльбе кватэры паміж маці і сынам. У нейкі момант жанчына заплакала. І сын раптам памяняў сваю пазіцыю, згадзіўся з іскавымі патрабаваннямі маці са словамі: «Хай так будзе, толькі б мама не плакала». У выніку суд прызнаў іскавыя патрабаванні маці, што дазволіла вынесці рашэнне на яе карысць. Хочацца верыць, што адной крыўдай на зямлі стала менш.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### ПАДАТКОВЫЯ ІНСПЕКТАРЫ БРАЛІ... ДЗВЯРЫМА

**Два старшыя дзяржаўныя падатковыя інспектары адной з раённых інспекцый Віцебска папаліся супрацоўнікам праваахоўных органаў пасля атрымання хабару. Адбылося гэта падчас арганізаванай так званай «кантрольнай закупкі».**

Інспектары за тое, што не будуць прыцягваць індывідуальнага прадпрымальніка да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне падатковага заканадаўства, узялі ў гэтага бізнэсмена ў «якасці падарунка» двое міжпакаёвых дзвярэй агульным коштам больш за 900 тысяч рублёў. Інспектары былі затрыманы. Пракуратурай узбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ЗАНІЗІЎ КОШТ — АТРЫМАЎ ХАБАР?..

**Пракуратура горада Мінска ўзбудзіла крымінальную справу ў дачыненні да былога галоўнага інжынера аднаго са сталічных закрытых акцыянерных таварыстваў.**

46-гадовы мінчанін, які зараз нідзе не працуе, у сакавіку, калі знаходзіўся пры пасадзе, як мяркуецца, не бясплатна дапамог прадстаўніку адной з фірмаў вырашыць «далікатнае» пытанне. У прыватнасці, падазраецца ён у тым, што за станоўчае вырашэнне пытання аб продажы сядзельнага цягача па заніжаным кошце атрымаў 4700 долараў ЗША хабару.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**

### РАБОЧЫ СКРАЎ АРМАТУРЫ НА 26 МІЛЬЁНАЎ

**Кіраўніцтва «Наваполацкжалезабетону» паведаміла ў міліцыю, што з незачыненага арматурнага цэха прадпрыемства, што знаходзіцца ў так званай прамысловай зоне, невядомыя скралі амаль 14,5 тоны металічнай арматуры.**

Страту ацанілі ў 26 мільёнаў беларускіх рублёў. Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі высветлілі, што ва ўчыненні злачынства можна абгрунтавана падазраваць 33-гадовага рабочага гэтага ж прадпрыемства — жыхара Полацка. Ён, як гаворыцца, кінуўся ва ўцёкі. Пры гэтым большую частку скрадзенага (12,8 тоны арматуры) на момант падрыхтоўкі публікацыі ўжо знайшлі на тэрыторыі мінскай фірмы. Узбуджана крымінальная справа. Высвятляюцца нюансы крадзяжу з маштабам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

31 кастрычніка 2008 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) пачне работу першая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання. Рэгістрацыя членаў Савета Рэспублікі адбудзецца 31 кастрычніка з 8.45 да 9.15.

## Еўрарамонт ад ЖЭСа?

**За студзень — жнівень гэтага года прадпрыемствамі сістэмы вытворчага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» насельніцтву аказана платных паслуг на амаль 14 мільярдаў рублёў. У параўнанні з 2001 г. адпаведны паказчык павялічыўся ў 28 разоў!**

Разам з тым, адзначыў намеснік дырэктара па эканоміцы аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Васіль Грамовіч, гэта не дазваляе кампенсаваць выдаткі на аказанне «кватэрных» паслуг насельніцтву. У выніку павышэння тарыфаў на тэхнічнае абслугоўванне жылля сёлета ў Мінску дадаткова будзе атрымана 8,8 мільярда рублёў. Таму ўзнікае патрэба ў пашырэнні пераліку платных паслуг — такім чынам жыллёва-эксплуатацыйныя арганізацыі здолеюць зарабіць неабходныя пазабюджэтныя сродкі. Як запэўніў Васіль Грамовіч, усяго сталічныя камунальнікі распрацавалі і зацвердзілі каля 950 (!) тыпавых відаў работ. Тарыфы на іх аказанне, паводле слоў спецыяліста, да 40 працэнтаў ніжэйшыя за рынкавыя расцэнкі.

Магчыма, у бліжэйшай перспектыве сіламі ЖЭСаў будзе праводзіцца комплексны рамонт кватэр па сучасных стандартах. У сталіцы ўжо ствараюцца асобныя ўчасткі па аказанні платных паслуг жыхарам.

Аднак, заўважыў Васіль Грамовіч, узнікае патрэба ў адпаведных спецыялістах, якія пачнуць праводзіць той жа еўрарамонт. ЖЭСы будуць прыцягваць кліентаў нізкімі расцэнкамі і абавязковым дакументальным афармленнем аказаных паслуг. Аднак якім чынам забяспечыць работнікам належны ўзровень аплаты працы? Пытанне пакуль застаецца без адказу...

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

## Уборка ўраджаю

### Мінусуем па кукурузе, але добра ўрадзілі бульба і цукровыя буракі

**На 20 кастрычніка ў краіне было ўбрана 42,72 тысячы га кукурузы на зерне, што складае толькі каля 27 працэнтаў запланаванай плошчы, паведамілі рэдакцыі ў галоўным упраўленні Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.**

Ураджайнасць кукурузы на зерне складае 61,73 ц/га, што на 3 цэнтнеры менш за мінулагодні паказчык. Не вельмі высокімі тэмпамі сёлета вядзецца і ўборка цукровых буракоў — разам з тым радуе іх высокая ўраджайнасць — 410,45 ц/га, што на 50 цэнтнераў з гектара больш, чым летась.

І бульба сёлета ўрадзіла. Ураджайнасць другога хлеба беларусаў складае 204,9 ц/га. Цяпер накапана амаль 906 тысяч тон бульбы. Летась на гэту дату была ўбрана амаль уся бульба, агульны валавы збор якой склаў каля 800 тысяч тон, пры ўраджайнасці 186,4 ц/га. Гэтай восенню вызначыліся тры «бульбяныя» вобласці краіны. У Гродзенскай вобласці сярэдняя ўраджайнасць другога хлеба складае 234,4 ц/га, у Магілёўскай — 236,9 ц/га і ў Мінскай — 205,4 ц/га.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

### ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

22 кастрычніка 2008 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу адзінаццатая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.


**СДАЮТСЯ В АРЕНДУ ПРОИЗВОДСТВЕННЫЕ И СКЛАДСКИЕ ПЛОЩАДИ**

от 500 м² до 15000 м² (30 км от кольцевой) в г.п. Радошковичи.

*Возможен последующий выкуп. Хороший подъезд, охраняемая территория.*

Тел. 8 029 673 77 70 (Николай Иванович).

УНП 190548835



КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЕ АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ:**

**производственно-складских баз** различного назначения:
- предприятие по производству блоков из пено- и газобетона с современным оборудованием: г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 8. По территории проходит ж/д ветка. Площадь земельных участков – 1,9529 га; 0,0516 га;
- деревообрабатывающее производство и складские помещения (1993–1995 г.п.): Гродненская область, Ошмянский район, д. Буденовка (54 км до г. Вильнюса). Площадь земельного участка – 3,6 га;
- цех по производству кирпича в составе зданий, сооружений, оборудования: Брестская область, Лунинецкий р-н, д. Намокрово, ул. Намокровская, 20. Площадь земельного участка – 2,8330 га;

**объектов недвижимости:**
- 2-этажного кирпичного здания механического цеха, об. пл. 1433,4 кв.м, расположенного по адресу: г. Молодечно, ул. Волынца, д. 12. Площадь земельного участка – 0,1073 га;
- 2-этажного кирпичного здания 1987 г.п., об. пл. 602 кв.м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, д. 8. Площадь земельного участка – 0,1109 га.

Необходимую информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by**

УНП 690324015


## Міжнароднае надвор'е

### ПА ЕЎРАСАЮЗУ — ПАЦЯПЛЕННЕ

**Беларуская дэлегацыя адчула гэта падчас нядаўняй міжпарламенцкай сустрэчы.**

Парламентарыі трэцяга склікання ўзялі ўдзел у рабоце 119-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза, якая прайшла ў Швейцарскім горадзе Жэневе. Па традыцыі гэты форум быў выкарыстаны ўдзельнікамі і для правядзення двухбаковых сустрэч. З індыйскімі калегамі, у прыватнасці, абмяркоўвалі перспектывы ўзаемадзеяння ў вытворчасці лекавых прэпаратаў. «У Індыі моцна развіта фармацэўтыка на травах, гэта выклікае інтарэс. Мы абмяркоўваем тэму стварэння сумеснай вытворчасці на нашай тэрыторыі. Перамовы ідуць, але прасілі парламентарыяў, каб народная дыпламатыя была ўключана для больш хуткага вырашэння гэтых пытанняў», — паведаміў журналістам старшыня Палаты прадстаўнікоў Вадзім Папоў.

Венгерскі бок у сваю чаргу праявіў інтарэс да наладжвання больш цесных адносінаў з Беларуссю. Як адзначыў В. Папоў, «гэта вельмі важна, таму што вось гэтыя пацяпленні па Еўрасаюзу, па Еўропе ў цэлым, яны выказваюцца і на сустрэчах парламентарыяў». Ён таксама выказаў меркаванне, што «ў наступнага парламента ёсць шырокае поле для дынамічнага працягу развіцця вось гэтага супрацоўніцтва (з ЕС. — **Аўт.**). Зарука таму — зняцце абмежаванняў на службовых асобах. Цяпер, я думаю, далей пойдзе і ў эканоміку...».

Апроч таго, па просьбе віцэ-спікера праводзілася сустрэча з прадстаўнікамі парламента Грузіі.

### З ГРУЗІЯЙ — БЕЗ АПАДКАЎ

**Беларускія дэпутаты перавялі гутарку з прадстаўнікамі гэтай дэлегацыі ў дыпламатычную плоскасць.**

Паводле слоў кіраўніка ніжняй палаты беларускага парламента, дэлегатаў з Грузіі цікавіла, ці будзе Беларусь зварочваць эканамічныя адносіны з гэтай краінай, ці будзе прымяняць нейкія санкцыі...

— Аднак мы вярнулі ўсё ў дыпламатычную плоскасць — няхай па лініі МЗС дзяржавы ўдакладняюць гэтыя адносіны, мы вядзём размову аб парламенцкім складніку, — падкрэсліў палітык.

Ён падзяліўся з журналістамі сваім меркаваннем аб тым, што двухбаковыя адносіны з Грузіяй Беларусі варта ў абавязковым парадку развіваць. І дадаў пры гэтым, што тое ж датычыцца адносінаў з усімі дзяржавамі на планеце: «У нас няма непераадольных супярэчнасцяў ні з адной дзяржавай, у тым ліку і з Грузіяй. Таму тыя пытанні, якія ёсць, іх трэба абмяркоўваць, а не старацца павярнуцца адзін да аднаго спінай... Гэта шкодна для абедзвюх дзяржаў». Вадзім Папоў рэзонна заўважыў, што цяжкасці ўзнікаюць і з той жа Расіяй — «то з цукрам праблемы, то з пастаўкамі сухога малака»...

### У САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЕ — ПАКУЛЬ ТУМАННА

**Прызнанне або непрызнанне незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, на думку Вадзіма Папова, будзе разглядацца новымі парламентарыямі.**

42 праграмы плануецца прафінансаваць налета з бюджэту Саюзнай дзяржавы. Асабліва адзначыў Вадзім Папоў праграму сумеснай вытворчасці лекавых сродкаў на аснове малака, атрыманага ад трансгенных жывёл, якое, паводле меркавання навукоўцаў, замяняе жаночае малако. Прыгадаў ён і праграму працягу асваення космасу ў інтарэсах народнай гаспадаркі абедзвюх дзяржаў — метэаназіранні, даследаванні зямной паверхні і іншае. Не ўтрымаліся журналісты і ад пытання аб прызнанні незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.

— Пытанне прызнання-непрызнання — гэта дастаткова тонкая матэрыя, — заўважыў кіраўнік Палаты прадстаўнікоў. — Гэта заўсёды працэс двухбаковых адносінаў, і толькі двухбаковых. Па-іншаму гэта не адбываецца, якія б там рашэнні міжнародныя структуры ні прымалі.

**Сярод 527 удзельнікаў чарговай Асамблеі Міжпарламенцкага саюза — 158 жанчын (прычым ад Ісландыі і Коста-Рыкі былі выключна дэлегаткі). Прадстаўнічасць дам у гэтай міжнароднай структуры не скарачаецца, аднак пакуль і не расце...**

Вадзім Папоў назваў гэта пытаннем будучага парламента. Дзеючы ж склад народных абраннікаў адпаведных дакументаў не атрымліваў.

— Гэтыя пытанні дастаткова далікатныя. Да іх трэба падыходзіць узважана, з улікам наступстваў у асноўным заўтрашняга і паслязаўтрашняга дня, а не імгненнай сітуацыі, — падкрэсліў спікер ніжняй палаты. Ён дадаў, што пытанні гэтыя будуць планамерна вывучацца, у выніку чаго будзе прынятае адпаведнае рашэнне. — Але адно трэба выразна ўсім засвоіць: калі пачынаць высвятляць адносіны з дапамогай сілы, у выніку якой гінуць міратворцы, мірныя жыхары, то незалежна ад першапачатковых намераў, гэта не можа разглядацца ў межах міжнароднага права... Гэта асуджае ўсё міжнароднае супольніцтва, і Еўрасаюз у тым ліку. Калі дзяржава пераступае статут ААН, то тут пытанне вельмі сур'ёзнае. Трэба такую дзяржаву ставіць на месца. Каб нікому не было дазваляльна здзяйсняць падобныя дзеянні...».

Кіраўнік ніжняй палаты беларускага парламента рэзюмаваў, што такія дзеянні ўсё роўна заканчваюцца за сталом перамоў... Пакуль жа парламентарыі Паўднёвай Асеціі і Абхазіі прынятыя ў Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі ў якасці назіральнікаў. «Гэта не новая з'ява, у Парламенцкім сходзе шмат і парламентаў, і грамадскіх рухаў, якія часам не поўнасцю падзяляюць пазіцыі Парламенцкага сходу», — адзначыў Вадзім Папоў.

Ён паведаміў таксама, што двухбаковая камісія закончыла работу над праектам Канстытуцыйнага акта Саюзнай дзяржавы. «Аднак гэта абсалютна не азначае, што Вышэйшы дзяржаўны савет будзе неадкладна яго разглядаць», — заўважыў старшыня Палаты прадстаўнікоў, спаслаўшыся на магчымасць таго, што эксперты Дзяржсавета могуць вярнуць дакумент на дапрацоўку.

Праект Канстытуцыйнага акта — дакумент дастаткова аб'ёмны (8 раздзелаў, 68 артыкулаў). Апроч іншага, ён прапісвае таксама працэдуру ўваходжання новых дзяржаў у Саюзную дзяржаву, і выхад з яе складу.

**Ала МАЧАЛАВА.**


ISSN 1990 - 763X


*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.10.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 114,00 |
| 1 еўра | 2 849,46 |
| 1 латвійскі лат | 4 016,34 |
| 1 літоўскі літ | 825,04 |
| 1 чэшская крона | 114,38 |
| 1 польскі злоты | 802,57 |
| 1 расійскі рубель | 81,13 |
| 1 украінская грыўня | 392,21 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 26,0561 |
| 10 UAH | 49,6307 |
| 1000 BYR | 12,3284 |
| EUR | 35,1731 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 20.10.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпісвайцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

# У Беларусі будзе гарантавана поўнае вяртанне ўкладаў у банках

**Такая магчымасць будзе прадугледжана ў Дэкрэце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, праект якога даручана ў сціслыя тэрміны падрыхтаваць Нацыянальнаму банку. Гэта даручэнне кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даў 17 кастрычніка старшыні праўлення Нацыянальнага банка Пятру Пракаповічу.**

У дэкрэце будуць прадугледжаны дзяржаўныя гарантыі па ўсіх укладах, незалежна ад іх велічыні, а таксама прыём укладаў насельніцтва як для грамадзян Рэспублікі Беларусь, так і замежных грамадзян не толькі ў неабмежаваных аб'ёмах, але і без дэкларацый, з поўным захаваннем тайны ўкладаў у адпаведнасці з беларускім заканадаўствам.

Пётр Пракаповіч адзначыў, што падрыхтоўка гэтага дакумента выклікана таксама і тым фактарам, што апошнім часам у сувязі з падзеямі ў суседніх краінах да нас стала звяртацца вельмі шмат замежных грамадзян з просьбай размясціць свае ўклады ў банкаўскай сістэме Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт таксама даручыў Нацбанку тэрмінова ўнесці на разгляд тыя нарматыўныя дакументы, якія дадуць магчымасць Беларусі ўвайсці ў лік першых 30 краін-лідараў у свеце па стварэнні спрыяльных умоў крэдытавання.

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб тым, што ў поўным аб'ёме выконваюцца ўсе прагнозныя паказчыкі, закладзеныя ў Асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі на 2008 год, і паказчыкі, накіраваныя на стварэнне ўмоў для эканамічнага росту краіны.

У Беларусі па-ранейшаму забяспечваецца стабільны курс нацыянальнай валюты. З пачатку года беларускі рубель умацаваўся адносна долара ЗША на 1,7 працэнта, а таксама ўмацаваўся адносна еўра і расійскага рубля.

Як запэўніў Пётр Пракаповіч, такі ж стабільны стан нацыянальнай валюты будзе забяспечвацца ў поўным аб'ёме да канца года ў адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі.

Паводле слоў кіраўніка Нацбанка, у гэтым годзе адзначаюцца беспрэцэдэнтна высокія аб'ёмы крэдытавання. За 9 месяцаў гэтага года ў параўнанні з такім жа перыядам мінулага года крэдытныя рэсурсы, выдзеленыя рэальнаму сектару эканомікі, узраслі больш як у 1,6 раза.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца фінансаванню дзяржаўных праграм, крэдытаванню насельніцтва, асабліва на жыллё і спажывецкія мэты. У 2009 годзе аб'ём ільготных крэдытаў насельніцтву павінен перавысіць аб'ём выдадзеных у 2008 годзе больш як у 1,4 раза, а пры неабходнасці сума можа быць павялічана. Пётр Пракаповіч запэўніў, што ўзрасце таксама аб'ём крэдытаў, што выдаюцца грамадзянам на жыллёвае будаўніцтва на агульных падставах.

Ён адзначыў, што працэнтная палітыка праводзіцца Нацбанкам у строгай адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі.

Старшыня праўлення Нацыянальнага банка асабліва падкрэсліў, што беларуская плацежная сістэма па-ранейшаму працуе ўстойліва, стабільна і без збояў.

Уклады насельніцтва за 9 месяцаў гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічыліся больш як на Br2,8 трлн. Гэта вышэй за прагнозныя паказчыкі, прадугледжаныя ў асноўных напрамках. У верасні і кастрычніку ўклады насельніцтва не зніжаліся, а, наадварот, узраслі. Як лічыць Пётр Пракаповіч, гэта вельмі важна на фоне тых негатыўных з'яў, што адбываюцца з укладамі насельніцтва ў суседніх краінах і ў цэлым у свеце. Гэта сведчыць аб тым, што беларусы давяраюць банкаўскай сістэме, дзяржаве. Банкаўская сістэма і дзяржава поўнасцю забяспечваюць гарантыі ўкладаў насельніцтва, падкрэсліў Пётр Пракаповіч.

Кіраўнік Нацбанка запэўніў Прэзідэнта, што і ў далейшым беларуская банкаўская сістэма будзе забяспечваць стварэнне ўмоў, неабходных для хуткага эканамічнага развіцця краіны, і на гэтай аснове — для павышэння жыццёвага ўзроўню людзей.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ЗАПАТРАБАВАЎ ДА 1 ЛІСТАПАДА ЗАВЯРШЫЦЬ УСЕ СЕЛЬГАСРАБОТЫ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў да 1 лістапада завяршыць усе віды сельскагаспадарчых работ, уключаючы ўзняцце зябліва. Такую задачу кіраўнік дзяржавы паставіў 17 кастрычніка ў час даклада міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Сямёна Шапіры.

У адваротным выпадку да ўсіх, хто не забяспечыць выкананне пастаўленай задачы, незалежна ад займаемай пасады будуць прыняты жорсткія меры, падкрэсліў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка выказаў заклапочанасць ходам асенніх палявых работ і даручыў у самыя кароткія тэрміны разабрацца з сітуацыяй у кожнай вобласці, дзе назіраюцца зрывы ў іх правядзенні, па рабоце службовых асобаў і прыняць неабходныя меры.

Кіраўнік дзяржавы быў праінфармаваны аб ходзе выканання яго даручэння па павышэнні эфектыўнасці функцыянавання галіны. У прыватнасці, аб падыходах па рэфармаванні сістэмы дзяржаўнага кіравання, а таксама па стварэнні сістэмы гаспадарчага кіравання ў гэтай сферы. Паводле слоў міністра, гэта сістэма павінна садзейнічаць павелічэнню патэнцыялу сельгасвытворцаў за кошт прыцягнення новых тэхналогій, укаранення навуковых распрацовак.

Прэзідэнту даложана аб мерах па стварэнні ў структуры Мінсельгасхарча прадуктовай кампаніі. Плануецца, што тут будуць сабраны прафесіяналы высокага ўзроўню, якія на дагаворных умовах будуць аказваць садзейнічанне суб'ектам гаспадарання па розных напрамках іх дзейнасці: ад пытанняў вытворчасці да рэалізацыі гатовай прадукцыі, а таксама праводзіць кансультаванне, аказваць навуковую і практычную падтрымку.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенного в доход государства гаража № 160 (общ. пл. 25,7 кв.м) с подвалом в ГСК «Свислочь» в г.п. Свислочь. Начальная цена 4 688 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.08.2008 г. Аукцион состоится **11.11.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимости, в том числе: ЛОТ № 2 – арочное сооружение с лесопильной рамой (501,8 кв.м) по адресу: Узденский р-н, пос. Смолзавод. Нач. цена 71 713 770 бел. руб.; ЛОТ № 3 – цех сборного железобетона с подстанцией и пропарочной камерой (921,7 кв.м) по адресу: г. Узда, ул. К. Маркса. Нач. цена 25 199 910 бел. руб.; ЛОТ № 4 – склад заполнителей (202,8 кв.м) по адресу: г. Узда, ул. К. Маркса. Нач. цена 13 531 860 бел. руб. Начальные цены лотов снижены на 20 %. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.04.2008 г. Аукцион состоится **11.11.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

**Бобровичский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНО ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже 3 (трех) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:**

**ЛОТ 3** — земельный участок в деревне Голубы, площадь участка 0,2355 га, кадастровый номер 622082603101000017, начальная цена 3 532 500 белорусских рублей (р. Першайка, р. Ислочь, лес); **ЛОТ 4** — земельный участок в деревне Яцково-Корчемные, площадь участка 0,1953 га, кадастровый номер 622082609601000014, начальная цена 2 929 500 белорусских рублей (р. Ислочь, рядом лес); **ЛОТ 5** — земельный участок № 1 в деревне Бобровичи, площадь участка 0,1474 га, кадастровый номер 622082601101000139, начальная цена 3 685 000 белорусских рублей (агрогородок).

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется в Главное управление МФРБ по Минской области РБ, р/с 3600614040063 в филиале № 605 МОУ «АСБ Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600037371, назначение платежа 04901, Бобровичский сельский исполнительный комитет. Оплата за объект должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня получения протокола о результатах аукциона. Аукцион состоится **31 октября 2008 г.** в 14.00 по адресу: д. Бобровичи, ул. Заречная, 2, зал заседаний. Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **29 октября 2008 года** до 17.00 по адресу: д. Бобровичи, ул. Заречная, 2, кабинет секретаря.

**Контактные телефоны: (801772) 37635, 37636.**

# ГАЛАЎНЫ БОЛЬ МОЖА СІГНАЛІЗАВАЦЬ АБ ЦЯЖКАЙ ХВАРОБЕ

Прамая лінія

**Няма чалавека, у якога хоць бы раз у жыцці не балела галава. А між тым, гэта не такі ўжо бяскрыўдны сімптом. Галаўны боль можа быць прадвеснікам вельмі грозных захворванняў. Такіх, як інсульты, пухліны, анеўрызмы галаўнога мозга, эпілепсія і г.д. Менавіта гэта сасудзістая паталогія ўваходзіць у сферу інтарэсаў урачоў-нейрахірургаў. І менавіта аб ёй ішла размова на нашай чарговай «прамой лініі». На пытанні чытачоў адказваў прафесар, загадчык нейрахірургічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Неўралогія і нейрахірургія», член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук, Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Арнольд Фёдаравіч СМЕЯНОВІЧ.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

☎ *— Добры дзень, Арнольд Фёдаравіч, тэлефаную з Гродна. Мяне завуць Міхаіл Патапавіч. Чуў, што ў вашым інстытуце была праведзена аперацыя па выдаленні пухліны галаўнога мозга па новай методыцы. Яе зрабілі нейрахірургі з Санкт-Пецярбурга. Хацелася б даведацца, у чым сутнасць аперацыі і ці валодаюць гэтай методыкай нашы спецыялісты? Ці ўсім пацыентам падыходзіць такі метад аператыўнага лячэння?*

— Скажу вам, што ўсе метады нейрахірургічнага лячэння хворых, якія існуюць сёння ў нас, забяспечаны. Эндаваскулярны метад, які вы маеце на ўвазе, таксама. Сутнасць яго ў тым, што ўрач-нейрахірург з дапамогай спецыяльнага катэтара праз сцегнавую артэрыю, аорту, сонную артэрыю і мозг падыходзіць да анеўрызмы мозга — пухіра на сасудзе, у які ўстаўляецца спіраль, каб «выключыць» гэтую анеўрызму. Безумоўна, гэты метад менш траўматычны, чым той, калі такая ж маніпуляцыя робіцца пры дапамозе прамога ўскрыцця чэрапа. Аднак эндаваскулярны метад мае свае недахопы. Калі пры трэпанацыі нейрахірург добра бачыць анеўрызму і ў выпадку яе разрыву можа прыняць хуткія меры, каб выратаваць чалавека, то новая методыка такіх шанцаў не дае. Барані божа, анеўрызма разарвецца, а каб заціснуць яе, і не даць крыві паступаць у мозг, спатрэбіцца ўскрываць чэрап. Імгненна зрабіць гэта немагчыма, чалавек загіне... Эндаваскулярны метад патрабуе абсталявання, якое вельмі дарага каштуе. Адна спіраль абыходзіцца ў 800—900 долараў. А такіх спіраляў патрабуецца да пяці. Таму гэтыя аперацыі ў нас будуць рабіцца толькі ў тых выпадках, калі мы не зможам выканаць аперацыю на адкрытым чэрапе.

☎ *— Іна Аляксандраўна звоніць з Хойнікаў. У мяне раптам нечакана дранцвеюць пальцы рук. Кажуць, што гэта можа быць перад набліжэннем інсульту. Ці так гэта?*

— Не заўсёды. Такое можа быць пры хваробе Рэно. Гэта захворванне перыферычных сасудаў арганізма. Пры ім узнікаюць спазмы сасудаў, адсюль і бледнасць пальцаў, рук, з'яўляюцца моцныя болі. Вам трэба абавязкова абследаваць сасуды, каб высветліць прычыну. А інсульт часцей за ўсё ўзнікае спакваля, непрыкметна.

☎ *— На провадзе Антаніна Пятроўна з Мінска. Якой дыеты трэба прытрымлівацца чалавеку, які перанёс інсульт?*

— Так, дыеты трэба абавязкова прытрымлівацца. З меню неабходна выключыць тлушчы, вострыя і вэнджаныя стравы, прадукты, якія ўтрымліваюць халестэрын. Ужывайце паболей раслінна-малочнай ежы. Але малако не павінна быць вельмі тлустым.

☎ *— Соф'я, званю з Чавусаў. Якія першыя сімптомы інсульту?*

— Адрозніваюць ішэмічныя і гемарагічныя інсульты. Пры ішэмічным адбываецца закупорка аднаго з сасудаў, якія сілкуюць пэўныя ўчасткі мозга. У залежнасці ад таго, які выключыўся сасуд, праяўляецца слабасць рукі, нагі. Калі такое ёсць у левым паўшар'і, то могуць быць парушэнні маўлення, калі ў пазваночных артэрыях, то церпяць так званыя ствалавыя структуры: мазжачок, ствалы мозга, і чалавека пачынае хістаць, парушаецца глытанне. Пры гемарагічным разрыве сасуда і кровазліцці ў мозг чалавек губляе прытомнасць. Аднак галоўны прадвеснік інсультаў — гэта атэрасклероз, які трэба абавязкова лячыць, праводзіць прафілактыку яго, захоўваць дыету і пэўны рэжым жыцця.

☎ *— З Салігорска звоніць Яўген. Ці існуе генетычная схільнасць да інсультаў?*

— Існуе, а больш канкрэтна — гэта генетычная схільнасць да атэрасклерозу, які часцей за ўсё і з'яўляецца прычынай інсульту. Калі блізкія родныя маюць ці мелі гэтую паталогію, то фактар рызыкі павышаецца.

☎ *— Мяне завуць Андрэй. Тэлефаную з Гомеля. Хацелася б даведацца, наколькі цесна спецыялісты вашага профілю супрацоўнічаюць з НДІ анкалогіі?*

— Супрацоўніцтва, безумоўна, ёсць. Але, на маю думку, яно павінна быць больш мэтанакіраваным. І працаваць трэба кожнаму ў сваім напрамку: мы, нейрахірургі, выдаляем пухліны, а анколагі павінны назіраць хворага, праводзіць лячэбныя і прафілактычныя мерапрыемствы, а менавіта прамянёвую і хіміятэрапію. Дарэчы, у нас будуецца нейрахірургічны цэнтр, дзе будзе працаваць сем аперацыйных у тры чаргі. У гэтым выпадку мы зможам поўнасцю забяспечыць усю нейраанкалагічную дапамогу ў рэспубліцы.

☎ *— Званю са Слуцка, завуць Людміла Мікалаеўна. Скажыце, у якіх выпадках пры гіпертанічнай хваробе можна прымяняць лячэнне травамі? І ці ёсць нейкія супрацьпаказанні для фітатэрапіі гіпертаніі?*

— Травы — гэта таксама свайго роду лячэбны прэпарат. І як усякія лекі могуць мець негатыўнае пабочнае ўздзеянне. Таму наконт прыёму фітатэрапіі трэба раіцца з урачамі-неўролагамі — спецыялістамі, якія займаюцца лячэннем гіпертанічнай хваробы.

☎ *— З Мінска турбуе Іван Пятровіч. Ці існуюць нейкія спосабы, каб аднавіць функцыі паралізаваных канечнасцяў пасля інсульту?*

— Яны ёсць, іх вельмі шмат. Гэта цэлая сістэма рэабілітацыі, якая прымушае часткі мозга, што не загінулі, пераключацца на выкананне функцый тых участкаў, што загінулі. Наш мозг настолькі пластычны, настолькі ўзаемазамяняльны, што часам, здавалася б, для чалавека нічога нельга зрабіць, але ж трэніроўкі па пэўнай методыцы аднаўлялі яго да пэўнай ступені. Было нямала выпадкаў, калі ў выніку рэабілітацыі ляжачыя хворыя пачыналі самі сябе абслугоўваць. Таму рэабілітацыя неабходная.

**«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.**
***(Працяг будзе.)***

## Спорт-тайм

### «ДЫНАМА» НА ПАД'ЁМЕ

Футбалісты мінскага «Дынама» атрымалі першую буйную перамогу ў чэмпіянаце Беларусі пад кіраўніцтвам сербскага спецыяліста Славалюба Мусліна. 19 кастрычніка ў матчы 27-га тура мінчане перамаглі наваполацкі «Нафтан» з буйным лікам — 3:0 (Гігевіч, 29, Мбанангой, 72, Гарбачоў, 85, у свае вароты) і замацаваліся на другім радку турнірнай табліцы. Бяспройгрышная серыя сталічнага клуба дасягнула сямі матчаў (нічыя і тры перамогі пры Ігару Крыўшэнку, нічыя і дзве перамогі пры Славалюбу Мусліну). Цэнтральны матч тура паміж БАТЭ і МТЗ-РІПА, які прайшоў 17 кастрычніка, завяршыўся нулявой нічыёй. На пасляматчавай прэс-канферэнцыі Віктар Ганчарэнка прызнаў вынік матча ўдалым для сваёй каманды, адзначыўшы, што футбалісты, якія вярнуліся са зборных, падышлі да матча не ў лепшым стане. Юрый Пунтус вынікам таксама не расчараваўся, падкрэсліўшы, што ў астатніх матчах яго сімпатыі будуць на баку барысаўскай каманды. Вынікі астатніх гульняў: «Дарыда» (Ждановічы) — «Граніт» (Мікашэвічы) — 0:3 (няяўка), «Дынама» (Брэст) — «Шахцёр» (Салігорск) — 2:1, «Віцебск» — «Смаргонь» — 2:0, «Днепр» (Магілёў) — «Гомель» — 1:1, «Тарпеда» (Жодзіна) — «Нёман» (Гродна) — 2:1, «Лакаматыў» (Мінск) — «Савіт» (Магілёў) — 2:0. Лідзіруе ў чэмпіянаце па-ранейшаму БАТЭ (57 ачкоў), на другім месцы сталічнае «Дынама» (53), на трэцім сталічны МТЗ-РІПА (51), чацвёрты «Шахцёр» (48). Наступны тур пройдзе 25 кастрычніка.

### ДЗЯВЯТАЯ ПЕРАМОГА «МЕТАЛУРГА»

Прайшлі чарговыя матчы Адкрытага чэмпіянату Беларусі па хакеі ў экстралізе. «Металургс» (Ліепая) — «Юнацтва» (Мінск) —3:4, «АСК-Агрэ» (Латвія) — «Хімвалакно» (Магілёў) — 3:4, «Гомель» — «Віцебск» — 2:1, «Металург» (Жлобін) — «Хімік-СКА» (Наваполацк) — 3:2, «Рыга-2000» (Латвія) — «Нёман» (Гродна) — 0:2, «Латгале» (Даўгаўпілс, Латвія) — «Брэст» — 2:4. Такім чынам, турнірную табліцу нацыянальнага першынства ўзначальвае па-ранейшаму мінскае «Юнацтва», на рахунку якога 37 ачкоў. Далей ідуць «Металург» — 36 і «Гомель» — 35.

### ГЛЕБ АДНАВІЎСЯ

Паўабаронца іспанскай «Барселоны» і зборнай Беларусі Аляксандр Глеб вярнуўся на поле пасля траўмы, атрыманай 13 верасня ў матчы чэмпіянату Іспаніі супраць «Расінгу». 19 кастрычніка 27-гадовы футбаліст узяў удзел у выязным матчы супраць «Атлетыка» з Більбао, замяніўшы на 80-й хвіліне Цьеры Анры. Гульня завяршылася з лікам 1:0 на карысць гасцей.

# А ДУМАЛІ, ШТО БОМБА

**Жыхароў 9-павярховага жылога дома ў Оршы давялося эвакуяваць.**

Раніцай у міліцыю патэлефанаваў электрамеханік, які абслугоўвае ліфты. Ён паведаміў, што на так званым тэхнічным паверсе 1-га пад'езда знойдзена прыстасаванне, па знешніх прыкметах вельмі падобнае на выбуховае.

Супрацоўнікі гарадскога аддзела міліцыі аператыўна прыехалі на месца і арганізавалі эвакуацыю. Прыбылі таксама і супрацоўнікі КДБ, МНС. Перапалох быў вялікі: нават кіраўніцтва гарвыканкама прыехала, каб быць у курсе спраў, намеснік пракурора вобласці. Прыкладна праз дзве гадзіны члены групы размініравання прыйшлі да высновы, што гэта толькі муляж. І выраблены вельмі старанна. На ім быў замацаваны нават пластмасавы рэгулятар з намаляванай выявай стрэлак. А «дынаміт» — усяго толькі пафарбаваныя трубкі з паперы.

Следчыя гарадскога аддзела міліцыі ўстанавілі, што за дзень да надзвычайнага здарэння муляж зрабіў вучань 9-га класа. А ў доме — у гэтым жа пад'ездзе, дзе ён «заклаў» самаробнае ўстройства, жыве яго старая бабуля. Дрэнны, незразумелы «жарт», за які давядзецца адказваць.

# Рухавікі застануцца бруднымі

Прадстаўнікі адміністрацыі віцебскага прадпрыемства «Даламіт» паведамілі ў РАУС Чыгуначнага раёна пра тое, што невядомы пасля завяршэння рабочага дня з будынка аўтамыйкі ў гарадскім пасёлку Руба скраў спецыяльны апарат для чысткі рухавікоў аўтамабіляў коштам амаль 9 мільёнаў беларускіх рублёў, узламаўшы дзвярныя запоры. Між іншым, тэрыторыя прадпрыемства ахоўваецца вартаўніком. Узбуджана крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПРЫГЛЯНУЛАСЯ «БЕЛАРУСАЧКА»

Жыхар в. Талмачова Столінскага раёна звярнуўся ў міліцыю з заявай аб тым, што з яго хаты нехта выкраў 29 бутэлек гарэлкі «Беларусачка». Сышчыкі хутка ўстанавілі, што гарэлку прыхапіў зяць заяўніка. Цесць пакінуў у дзвярах ключ, а астатняе было проста.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

**РУП «Белспецконтракт» проводит 11-й открытый аукцион объектов республиканской собственности 5 ноября 2008 г.**

| Лот | Наименование объекта (местонахождение объекта, общая площадь (кв.м) | Начальная цена продажи объекта (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Площадь отчуждаемого участка (га) | Форма проведения торгов |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 2. | Здание казармы с крыльцами, военный городок № 65, г. Гомель (канализация, кабельная линия, тепловая сеть, водопровод, пристройка). Инв № 65/1, 1956 г.п., 719 кв.м | 480 000 000 | 48 000 000 | 0,5021 | Без условий |
| 3. | Здание бани с крыльцами, военный городок № 65, г. Гомель (кабельная линия, канализация, тепловая сеть, водопровод). Инв № 65/13, 1995 г.п., 295 кв.м | 152 000 000 | 15 200 000 | 0,1021 | Без условий |
| 6. | Здание кафе с подвалом, военный городок № 76а, д. Новая Гожа Гродненского р-на (асфальтобетонное покрытие, бортовой камень). Инв. № 76а/29, 1981 г.п., 638,2 кв.м | 73 000 000 | 7 300 000 | 0,0847 | Без условий |
| 8. | Здание производственного корпуса № 150, военный городок № 7 «Улуковье» п. Победа Гомельского р-на (канализация, тепловая сеть, электрические сети, водопровод). Инв. № 7/150, 1968 г.п., 1260,3 кв.м | 234 500 000 | 23 450 000 | 0,2079 | Без условий |
| 9. | Здание поликлиники, военный городок № 1 «Крепость» г. Бобруйск. Инв. № 1/39, 1840/1993 г.п., 652 кв.м | 1 406 220 000 | 140 622 000 | 0,2368 | Без условий |
| 10. | Здание контрольно-технического пункта, в т.ч. мастерские с асфальтовым мощением. Военный городок № 5 «Авиагородок», г. Бобруйск. Инв. № 5/306, 177 кв.м | 83 500 000 | 8 350 000 | 0,0386 | Без условий |
| 11. | Здание неотапливаемого гаража, в/г № 5 «Авиагородок» г. Бобруйск (асфальтовое мощение). Инв. № 5/305, 1196 кв.м | 160 000 000 | 16 000 000 | 0,2692 | Без условий |
| 12. | Здания: КПП (инв. № 1), АЗС (инв. № 6), склада ГСМ (инв. № 7), ограждение железобетонное (инв. № 8), асфальтобетонное покрытие (инв. № 9), ограждение деревянное на деревянных столбах (инв. № 10), ограждение деревянное на железобетонных столбах (инв. № 11), место для хранения угля (инв. № 12), кабельные линии электропередач в пласт. оболоч. (инв. № 13), наружные сети водопровода стл. (инв. № 14а), наружные сети водопровода чугун. (инв. № 14б), наружные сети связи в грунте (инв. № 15а), наружные сети связи в канализации (инв. № 15б), наружные сети канализ. чугун. (инв. № 18а), наружные сети канализ. керамические (инв. № 18б) в в/г № 96 «Чепино», г. Витебск | 102 000 000 | 10 200 000 | 2,2441 | Без условий |

**Тип помещений:** отдельно стоящие. Здания в аренде не находятся.

Окончательное решение об отводе земли принимается местными органами власти.

Аукцион состоится в 11 часов 5 ноября 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 3 ноября 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604 предприятия.

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны представить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица представляют необходимый пакет документов.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи 5 ноября 2008 г.
2. Произвести оплату стоимости объекта в течение 30 календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.**

По ранее проведенным торгам извещения публиковались в газете «Звязда» 1 и 20 декабря 2007 года, 6 августа (Лоты № 10, № 11, № 12), по всем указанным лотам 12 сентября 2008 года.

Справки по тел. 017, тел./факс 224 88 05.

**Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com; e-mail: info@belspeckontrakt.com**

## Абзац

■ 65 гадоў таму, 19—22 кастрычніка 1943 года, прайшла аперацыя партызанскіх злучэнняў па разгроме Лепельскага і іншых буйных фашысцкіх гарнізонаў у тыле нямецкай 3-й танкавай арміі, якая ўвайшла ў гісторыю Вялікай Айчыннай як Лепельская аперацыя. У ёй удзельнічала больш за 20 партызанскіх брыгад і палкоў пад камандаваннем Фёдара Дуброўскага.

**■ Пракуратура праводзіць праверку па факце атручэння чадам падпалкоўніка міліцыі і яго сям'і. Целы падпалкоўніка, 1968 г. н., а таксама яго жонкі і сына выяўлены ў іх кватэры на вул. Валгаградская ў Мінску. Папярэдняя прычына смерці — атручэнне газам. У кватэры быў выяўлены таксама загінулы сабака. Мяркуецца, што вентыляцыйная шахта газавай калонкі, якая ўсталяваная ў кватэры, была забітая.**

■ На Чырвонабярэжскім крухмалапатачным заводзе, што на Гомельшчыне, пры гідраапрацоўцы бульбы, прывезенай з палёў, выявілі прадметы, падобныя на боепрыпасы. Сапёры, якія прыехалі на завод, дасталі з бульбы артылерыйскі снарад, мінамётную міну і гранату часоў Вялікай Айчыннай вайны. Боепрыпасы вывезены за горад і знішчаны.

**■ Буйное ДТЗ адбылося ў нядзелю на ўсходзе Францыі: тут сутыкнуліся адразу 28 аўтамабіляў. Загінуў адзін чалавек, знявечаныя і параненыя 39 чалавек. Да месца здарэння прыбылі 230 паліцэйскіх і выратавальнікаў.**

■ У адным з сёлаў Закарпацкай вобласці дзіцячы садок, размешчаны ў старым будынку, што патрабуе рамонту, атакавалі змеі. Галовы і хвасты, што тырчалі з-пад дзіцячых ложкаў, заўважыла падчас «ціхага часу» загадчыца. Не чакаючы дапамогі выратавальнікаў, дарослыя самастойна сталі лавіць няпрошаных гасцей. Пасля гэтага загадчыца наадрэз адмовілася прымаць дзяцей да поўнага рамонту садка і ліквідацыі вялізных трэшчын, якімі пакрыліся сцены будынка.

**■ У ДТЗ, што адбылося ў Маскве, пацярпелі, згодна з папярэднімі звесткамі, 7 грамадзян Беларусі. Мікрааўтобус наехаў на перашкоду, пасля чаго перавярнуўся. У выніку 7 чалавек атрымалі раненні, ім аказана медыцынская дапамога.**

## Поўны абзац

■ Злодзей, які залез у дом да пажылой брытанкі і застаў гаспадыню дома, прыслаў ёй назаўтра букет кветак, каб папрасіць прабачэння. Зламыснік залез у дом да 91-гадовай бабулі каля 4 гадзін раніцы, але сутыкнуўся з ёй і быў вымушаны збегчы. Адразу пасля гэтага ён прыслаў ёй кветкі і запіску. Як патлумачыў няўдалы злодзей, ён залез у дом, так як думаў, што там ніхто не жыве. Прадстаўнік паліцыі заявіў мясцовай газеце, што ніколі не сутыкаўся ні з чым падобным за ўсю сваю службу. Паліцэйскія хацелі б пагутарыць з «сумленным злодзеем» і заклікалі яго звязацца з імі.

**■ З банкаўскага рахунка прэзідэнта Францыі Нікаля Сарказі знікла некаторая сума грошай. Зламыснікі нейкім чынам даведаліся банкаўскія рэквізіты прэзідэнта — як мяркуецца, праз інтэрнэт. Падрабязнасці расследавання і сума скрадзеных грошай не ўдакладняюцца. Афіцыйныя крыніцы пацвердзілі толькі факт звяртання Сарказі ў паліцыю і тое, што пачалося расследаванне.**

■ Жыхары Тэгерана з'елі самы вялікі ў свеце сэндвіч да таго, як ён быў вымераны прадстаўнікамі Кнігі рэкордаў Гінэса. Пры прыгатаванні паўтаракілаграмовага сэндвіча было выкарыстана па 700 кг стравусінага мяса і кураціны. Сэндвіч выставілі на ўсеагульны агляд у парку Тэгерана. Але гледачы не сталі чакаць, пакуль яго змераюць. У лічаныя хвіліны сэндвіч быў з'едзены цалкам, не пакінуўшы нічога прадстаўнікам Кнігі рэкордаў. Арганізатары акцыі вырашылі ўсё ж адправіць у камісію Кнігі рэкордаў відэазапіс, на якім можна ўбачыць сэндвіч.

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**Ивенецкий сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:**

**ЛОТ 1** — земельный участок № 1 в д. Провжалы Ивенецкого с/с, площадь участка 0,2500 га, начальная стоимость 3 075 000 белорусских рублей;

**ЛОТ 2** — земельный участок № 1 в д. Шикути Ивенецкого с/с, площадь участка 0,2500 га, начальная стоимость 2 000 000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Имеются в непосредственной близости река и лес. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3600614030057 в филиале № 605 МОУ «АСБ Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, назначение платежа 04901, УНП 600037397, ОКПО 04432334, Ивенецкий сельский исполнительный комитет. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня получения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **21 ноября 2008 г.** в 15.00 по адресу: г.п. Ивенец, пл. Свободы, д. 2, 2 этаж, зал заседаний. Заявления на участки и необходимые документы принимаются до 17.00 до **21 ноября 2008 года** по адресу: г.п. Ивенец, ул. 1 Мая, д. 13 (кабинет секретаря).

**Контактные телефоны: (801772) 53388, 53587.**

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2008 года

### ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2008 г. | 01.10.2007 г. |
|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* |
| *1* | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 6 420,0 | 4 969,9 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 9 622,7 | 6 633,3 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 0,0 | 3 053,5 |
| | для торговли | 11031 | 0,0 | 3 053,5 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 0,0 | 0,0 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 0,0 | 0,0 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 19 938,8 | 23 642,5 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 90 270,1 | 46 150,6 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 0,0 | 0,0 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 18 582,2 | 13 715,3 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 1 971,0 | 1 349,7 |
| **10** | **ИТОГО активы** | **110** | **146 804,8** | **99 514,8** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 0,0 | 0,0 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 33 389,2 | 18 685,3 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 63 825,3 | 51 200,5 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | 9 135,7 | 48,0 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 3 990,2 | 2 169,9 |
| **17** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | **110 340,4** | **72 103,7** |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 16 864,4 | 14 545,5 |
| 20 | Эмиссионные разницы | 1212 | 0,0 | 0,0 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 2 550,6 | 1,4 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 6 704,2 | 7 088,2 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 10 345,2 | 5 776,0 |
| **24** | **ВСЕГО капитал** | **121** | **36 464,4** | **27 411,1** |
| **25** | **ИТОГО обязательства и капитал** | **12** | **146 804,8** | **99 514,8** |
| 26 | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 39 091,8 | 20 311,3 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 18 603,9 | 13 740,8 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2008 года

*(в миллионах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2008 г. | 01.10.2007 г. |
|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 6 787,0 | 6 071,2 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 3 279,6 | 3 286,9 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 3 507,4 | 2 784,3 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 6 525,4 | 4 721,8 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 305,2 | 157,6 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 6 220,2 | 4 564,2 |
| 7 | Чистый доход от операций с иностранной валютой | 203 | 3 553,5 | 1 916,3 |
| 8 | Чистый доход от операций с ценными бумагами | 204 | -2,8 | -7,4 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | 0,0 | 0,0 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 60,1 | 128,2 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 1 287,9 | 108,7 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 9 585,7 | 5 907,9 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 729,7 | 447,8 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 1 344,8 | 665,4 |
| *15* | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | **2 845,9** | **2 216,8** |

**Председатель Правления** **А.Е. Киреев**

**Главный бухгалтер** **Н.А. Кузьмицкая**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 20 от 13.02.2007 г. УНП 100195493*

## Рэйс не адновяць, бо ён не акупляе сябе

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З вёскі Нарач Вілейскага раёна паскардзіліся на адмену аўтобуснага маршрута «Вілейка — Смаргонь», дакладней, рэйса з часам адпраўлення на 16.40 у суботу з Вілейкі.**

— Столькі гадоў ён існаваў, а тут у жніўні яго знялі. Як цяпер студэнтам (а яны едуць і з Мінска, і з Гомеля, і з Гродна) дабірацца дадому? — пыталіся заяўнікі. — Хіба толькі ў суботу на 11.20 выязджаць апошнім рэйсам? А калі не атрымліваецца, даводзіцца ці не 20 кіламетраў пехатой ісці, лавіць спадарожныя машыны. Куды мы ўжо толькі ні звярталіся з гэтай праблемай, аднак канкрэтнага адказу нідзе не атрымалі. Хоць і дэпутат райсавета абяцаў, і ў райвыканкаме нешта такое таксама гаварылі. У аўтапарку сказалі, што рэйс нерэнтабельны. Трэці месяц людзі чакаюць...

— Згодны, магчыма, нехта з пасажыраў, тых жа студэнтаў, церпіць цяпер нейкія нязручнасці ад адмены рэйса «Вілейка — Смаргонь» у суботу на 16.40. Але давядзецца неяк перабудоўвацца, прыстасоўвацца да новага раскладу, бо памянёны рэйс на азначаны час мы пакуль аднаўляць не збіраемся, — адказаў нам начальнік аддзела перавозак Вілейскага аўтапарка № 5 Аляксандр Галко. — Прычына сапраўды ў яго нерэнтабельнасці, адсутнасці пасажырапатоку.

Паводле далейшых слоў суразмоўцы, названы маршрут з'яўляецца міжгароднім (міжабласным), адпаведна, ён не датуецца. Калі акупнасць маршруту ўвогуле складае 80 працэнтаў, дык канкрэтнага рэйса ў суботу на 16.40 — толькі 40 працэнтаў.

— Уведзены дадатковы рэйс у пятніцу на 17.40. Заняткі ў студэнтаў заканчваюцца недзе а 15-й гадзіне, на яго можна паспець. Хто не змог — калі ласка, у суботу ёсць рэйсы на 7.00 і 11.20. Па нядзелях, каб вярнуцца назад, захаваліся тры рэйсы на 7.00, 11.20 і 16.40, — сказаў Аляксандр Міхайлавіч. — Ніякіх іншых прычын адмены рэйса ў суботу, акрамя нерэнтабельнасці, няма.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Энергазберажэнне

## ЦЁПЛЫЯ ФАРБЫ МСЦІСЛАВА

**Раённы цэнтр гэтымі днямі завяршае капітальны рамонт і цеплярэнавацыю старога жыллёвага фонду, у межах падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезона.**

На вуліцы Савецкай, 26 у цэнтры Мсціслава — суцэльны рамонт. Будаўнічыя лясы, крыкі рабочых, грукат тэхнікі, брудная лужына замест дваровой тэрыторыі. Аднак насуперак усім гэтым рамонтным жахам, кватэраўладальнікі — у прыступе шчасця.

Нагодай для добрага настрою стала ўсталяванне ў кватэрах сучасных шклопакетаў за дзяржаўны кошт.

— Безумоўна, я вельмі задаволеная, — шырока ўсміхаецца жыхарка 14-й кватэры Вольга Сямёнаўна Сазонава. — Заклейваць іх у адрозненне ад старых не трэба. У іх добрая цеплаізаляцыя. І калі новыя вокны паставілі — адразу ў кватэры прыемна стала. А раней, за такім восеньскім часам мы вельмі замярзалі. Цяпер жа маленькай унучцы тоўстыя шкарпэткі з воўны апранаць не трэба. І дзякуй за гэта ўладам: са сваёй пенсіі я ніколі ў жыцці дарагія шклопакеты не ўсталявала б!

Старажытны Мсціслаў упрыгожваюць шматлікія помнікі архітэктуры, цяпер жа яго аблічча не псуюць і будынкі савецкага перыяду. Жылыя дамы, узведзеныя яшчэ ў 70—80-я гады мінулага стагоддзя, радуюць вока прыемнымі фарбамі. У цэнтры горада ліквідавалі агароды, добраўпарадкавалі дваровыя тэрыторыі.

Але справа тут не толькі ў афарбоўцы і навядзенні парадку на зямлі. Начальнік аддзела архітэктуры і будаўніцтва Мсціслаўскага райвыканкама Ігар Савіцкі растлумачыў, што за савецкім часам існавалі будаўнічыя стандарты, у тым ліку па цеплаізаляцыі, аднолькавыя для спякотнага Поўдня і халоднай Поўначы адной вялікай краіны. Для сырой восені і марознай зімы Беларусі тых нормаў было малавата. Ды і энергазберажэнне толькі цяпер стала адной з самых актуальных задач сучаснасці.

— Стары жыллёвы фонд не эканоміць цяпло, якое падаецца ў нашы дамы, — сказаў Савіцкі. — Вялікія страты цяпла адбываюцца праз вокны, дахі і сцены. Гэтыя праблемы мы вырашылі капітальным рамонтам і цеплярэнавацыяй большасці шматкватэрных дамоў раённага цэнтра савецкай забудовы.

Болей за 2 тысячы квадратных метраў жылля адрамантавана ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі энергазберажэння. Большасць дамоў прайшла цеплярэнавацыю: гэта калі на сцены, пад тынкоўку, накладаюцца мінералватныя пліты, і атрымліваецца нешта накшталт шматслойнага бутэрброда. Такі бутэрброд плюс новыя вокны без шчылінаў дазваляюць эканоміць да 40 працэнтаў цеплаэнергіі.

— На капітальны рамонт выдаткавана 1 мільярд 760 мільёнаў рублёў з раённага і рэспубліканскага бюджэтаў, — паведаміў спецыяліст раённага аддзела архітэктуры і будаўніцтва Дзмітрый Ткачоў.

Безумоўна, што рэнавацыя жылля датычылася многіх, але ўсё ж не ўсіх кватэр Мсціслава. Таму не выклікае здзіўлення павелічэнне колькасці зваротаў, просьбаў і патрабаванняў у органы ўлады ад тых, каму не пашанцавала скарыстацца ўсеагульным рамонтам у Мсціславе, першым такога маштабу за апошнія гады.

— Так, па-добраму, трэба было б рабіць падобным чынам усюды і ўсім, але гэта каштуе вялікіх грошай, — пракаментаваў сітуацыю Ігар Савіцкі. — І ўсё, што можна, улада робіць для людзей. Каб унесці нотку аптымізму для ўсіх мсціслаўцаў, я скажу, што рыхтуецца Указ Прэзідэнта аб развіцці Мсціслава і раёна як гісторыка-культурнага цэнтра. Калі гэта спраўдзіцца, то можна чакаць не толькі аднаўлення гістарычных помнікаў, але і ўсеагульнага добраўпарадкавання. А цяпер трэба радавацца, як добра стаў выглядаць наш Мсціслаў і падтрымліваць чысціню і парадак у сваім горадзе. Дарэчы, у канцы месяца тут пройдзе выязное пасяджэнне Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

**Ілона ІВАНОВА.**
*г. Мсціслаў.*



Адраджэнне гаспадара

# КАЛІ ЧАЛАВЕК ХОЧА АДКРЫЦЬ СВАЮ СПРАВУ — ЯМУ НЕАБХОДНА МАКСІМАЛЬНА ДАПАМАГЧЫ, — лічаць у Бярозаўскім райвыканкаме

**Бярозаўскі раён сам сябе корміць — абыходзіцца без датацыі. Сюды едуць замежныя інвестары. Чаму?**

**МНОГА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ — МНОГА КЛОПАТУ**

«Надвор'е» ў раёне робіць прамысловасць, на ёй усё завязана. З 88,5 мільярда рублёў, якія паступілі ў 2007 годзе ў бюджэт раёна ў выглядзе падаткаў, пераважны працэнт прыпадае на прамысловасць.

Але наяўнасць прадпрыемстваў на тэрыторыі раёна яшчэ не гарантуе эканамічнай стабільнасці — неабходна, каб тыя прадпрыемствы былі рэнтабельныя.

Прадукцыя ААТ «Бярозаўскі сыраробны камбінат» і ААТ «Бярозаўскі мясакансервавы камбінат» вядомая за межамі краіны, і менавіта на гэтыя прадпрыемствы прыпадае найбольшы працэнт аб'ёму экспарту раёна — сыраробны камбінат дае 31,5 працэнта, а мясакансервавы — 34,8 працэнта. Калі да гэтых прадпрыемстваў дадаць яшчэ і «Белаазёрскі энергамеханічны завод» з 14,8 працэнта экспарту, то ўбачым, што гэтыя прадпрыемствы цягнуць экспартную лямку.

Дарэчы, сальда знешнеэканамічнага абароту раёна станоўчае.

Ды і іншыя прадпрыемствы не топчуцца на месцы. ААТ «Цеплапрыбор» выконвае заказ для «Белкамунмаша» — выпускае каркасы для тралейбусаў, а на ААТ «Бярозабудматэрыялы» запушчана новая лінія па вытворчасці керамічнай пліткі.

Улічваючы, што Бяроза — райцэнтр не такі і вялікі (30 тысяч жыхароў), то наяўнасць такой колькасці прадпрыемстваў стварае пэўныя ўмовы для развіцця раёна, а яго кіраўніцтву дае магчымасць спакойна жыць?

— Кіраўнікі з другіх раёнаў іншым разам і кажуць: «Пры такой прамысловасці і я гора не ведаў бы». Але ж гэта толькі здаецца так, бо неабходна, каб прадпрыемствы працавалі і выконвалі паказчыкі. Давялося навесці парадак з кадрамі, пад 50 працэнтаў кіраўнікоў у прамысловасці было заменена. Давялося папрацаваць і з інвестарамі, — расказвае старшыня райвыканкама Юрый Наркевіч.

Ёсць прымаўка «Шыя ёсць — хамут знойдзецца». Вось да Бярозаўскага мясакамбіната і далучылі Баранавіцкі мясакамбінат, які аказаўся ў завале. А да сыраробнага камбіната — Івацэвіцкі і Іванаўскі малаказаводы ды сельгаскааператыў «Прамень».

Прадпрыемствы і надалей будуць працаваць стабільна, хоць рэнтабельнасць на камбінатах невысокая.

Тым не меней за апошнія тры з паловай гады аб'ём прамысловай вытворчасці раёна вырас больш чым у два разы.

Прыкмеціў, што ў райцэнтры, то тут, то там за платамі нешта разбіраюць, дэманціруюць, рамантуюць... Аказалася, што закінутыя будынкі набылі прадпрымальнікі.

— Калі чалавек сам лезе ў хамут і бачыць у гэтым радасць, то трэба дапамагчы яму надзець той хамут, а каб не скінуў, то яшчэ і засупоніць, — пажартаваў намеснік старшыні райвыканкама Мікалай Чыж.

Мне падумалася, што ў гэтым жарце ёсць вялікая праўда. Хоча чалавек стаць прадпрымальнікам, мець свой бізнэс і ўзваліць на сябе ўсе звязаныя з гэтым турботы, то трэба яго падтрымаць. Няхай вырабляе, абслугоўвае, гандлюе... і пажадана, каб як мага глыбей ён уцягнуўся ў гэты працэс, каб грошы яго былі ў справе. І дзяржава павінна быць зацікаўленая ў дзелавой актыўнасці такіх людзей.

**ІНВЕСТАРЫ ТАМ, ДЗЕ ЛЕПШ**

У Бярозаўскім раёне 14 прадпрыемстваў, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца замежныя кампаніі ці фізічныя асобы. Іншаземцы імкнуцца ў Бярозу, бо кіраўніцтва раёна ідзе насустрач інвестарам і з разуменнем ставіцца да іх праблем.

За апошнія два гады тут пачалі вытворчасць:

фірма «Франдэса» (Ізраіль) — выпускае хімічныя сродкі аховы раслін. «Палескія шкляныя сістэмы» (Польшча) — наладзілі вытворчасць шклопакетаў (вокнаў); фірма «Сарыя Бія-Індастрыс» (Германія) — займаецца перапрацоўкай сыравіны жывёльнага паходжання.

А на прыкладзе СТАА «Будаўнічая кампанія «Дабрыня» (Польшча) можна ўбачыць, як адбывалася станаўленне гэтага прадпрыемства.

Калі палякі заявілі, што хацелі б на тэрыторыі раёна адкрыць будаўнічую кампанію, то ім прапанавалі пустыя будынкі былога завода жалезабетонных вырабаў і ПМК-4.

«Дабрыня» прывяла ў парадак тыя будынкі, закупіла нямецкае абсталяванне і пачала выпускаць пенапалістырольныя блокі і пліты для ўцяплення будынкаў. Прадукцыя запатрабаваная і дасць магчымасць скараціць паступленне ў краіну аналагічнай імпартнай прадукцыі.

Сёння на прадпрыемстве працуе 45 чалавек, але гэта толькі пачатак. Вытворчасць будзе пашырацца, а калектыў расці. У 2008 годзе запланавана выпусціць 100 800 кубічных метраў пенапалістырольнага ўцяпляльніка, а ў 2010 годзе вытворчасць вырасце на 30 працэнтаў.

«Дабрыня» — самае буйнае прадпрыемства ў сваёй галіне на тэрыторыі Беларусі. З'яўленне такой фірмы ў раёне трэба толькі вітаць. СТАА «Будаўнічая кампанія «Дабрыня» ўключана ў Пералік арганізацый, якія зарэгістраваныя і ажыццяўляюць дзейнасць у малых і сярэдніх гарадскіх населеных пунктах, якім на 2007—2010 гады даюцца льготы па падатках на прыбытак і яшчэ шэраг ільгот.

***Вось такі падыход да інвестараў можна лічыць дзяржаўным. Неабходна іх максімальна прывязаць да свайго раёна, каб прадпрыемствы развіваліся і пашыраліся, адным словам, трэба іх «засупоніць».***

Пазіцыя кіраўніцтва раёна зразумелая, а што думае намеснік дырэктара «Дабрыні» Аляксандр Параскевіч?

— На прадпрыемстве ўстаноўлена самае сучаснае абсталяванне, наша прадукцыя самай высокай якасці. Здавалася б, мы павінны былі б выціснуць канкурэнтаў, якія гандлююць імпартнай прадукцыяй, што па многіх параметрах саступае нашай, але не ўсё так проста. За імпартнай пенапалістэрольнай прадукцыяй стаяць лабісты, якія хацелі б, каб усё заставалася, як раней. І часта асабістае бярэ верх над дзяржаўнымі інтарэсамі. Весці барацьбу за рынак у такіх умовах складана, але асаблівых прэтэнзій у фірмы няма. А тое, што кантралёры даймаюць, то ад гэтага нікуды не дзенешся.

Калі за нейкі тыдзень-другі на прадпрыемстве пяць-шэсць праверак, то гэта мнагавата. Не будзем забываць, што фірма толькі пачала раскручвацца.

Пры ўсіх мінусах будаўнічая кампанія «Дабрыня» для сваёй прадукцыі ўжо адваявала палову беларускага рынку і ў гэтым плане ў прадпрыемства ёсць перспектыва.

А кіраўніцтва раёна ўжо мае напрацоўкі з чэхамі, якія таксама не супраць выступіць у ролі інвестараў.

Інвестараў мала запрасіць, ім неабходна зрабіць прапановы ад якіх яны не здолелі б адмовіцца. Вобразна кажучы, прапанова якраз і ёсць той «хамут», які замежны інвестар з радасцю мог бы на сябе надзець.

**ПАМІЖ МІНУЛЫМ І СУЧАСНЫМ**

Цікава, што ў Бярозаўскім раёне не існуе заняпалых гаспадарак. У эканамічным плане вялікіх разбежак паміж сельгаскааператывамі няма. А гэта даволі рэдкая ў наш час з'ява. Але мы спынімся на СВК «Аграфірма «Малеч», якую ўжо 22 гады ўзначальвае Іван Данілевіч. У пасёлку Малеч ёсць бальніца, Дом культуры, гасцініца... усё, што неабходна чалавеку для жыцця. Але фундамент сённяшняга дабрабыту тут быў закладзены яшчэ за савецкім часам. І не дзіўна, што Іван Мікалаевіч з настальгіяй успамінае той перыяд і паказвае поле Кавалёнка і гару Машэрава, на якіх устаноўлены памятныя знакі паводле яго эскіза, паказвае помнік-гармату і ваенныя знішчальнікі на пастаментах... І трэба адзначыць, што заслуга Івана Данілевіча найперш у тым, што ён здолеў у часы распаду Саюза захаваць гаспадарку, зберагчы набыткі мінулага.



У Івана ДАНІЛЕВІЧА свая праўда.

Старшыня сельгаскааператыва ўпэўнены, што ў нашай сельскай гаспадарцы адзін шлях — гэта буйныя СВК, прыкладна такія, як аграфірма «Малеч».

— Здаецца, мы ўжо гэта праходзілі, бо ў былым Саюзе ішлі ў гэтым напрамку, а каўбасы ў магазінах асабліва відаць не было.

— Затое яе хапала ў кожным халадзільніку, — адказаў І. Данілевіч.

Мусілі прызнаць: сёння нярэдка бывае і наадварот.

Пасля паездкі па гаспадарцы старшыня ўсё ж пагадзіўся, што працэнтаў дваццаць зямлі можна аддаць фермерам, але тут жа агаварыўся, што сярод іх гаспадара цяжка знайсці.

«Малеч» прытрымліваецца малочна-мяснога накірунку ў жывёлагадоўлі, надоі тут па 6600 кілаграмаў ад каровы. Праўда, І. Данілевіч упэўнены, што праз два гады ў яго гаспадарцы каровы будуць даваць па 8 тысяч кілаграмаў малака, хоць ужо сёння некалькі дзясяткаў кароў даюць больш чым па 10 тысяч.

А збожжа ўзялі з гектара па 45 цэнтнераў і гэта пры тым, што бальнасць зямлі ў гаспадарцы нізкая — 28 балаў.

Некалі ў «Малеч» дэлегацыі прыязджалі адна за адной. Бывалі гады, калі колькасць іх дасягала паўтары сотні — было што паказаць.

Трэба адзначыць, што і сёння тут парадак. На ферме, якой 47 гадоў, — чысціня. Палі зеленеюць, на фоне лесу — два рады новых домікаў. Пытаюся, ці за свае грошы ўзведзены.

— Калі дзяржава дае, то грэх было адмовіцца, — сказаў старшыня.

Іван Данілевіч аб'ехаў «увесь свет» і прыйшоў да высновы:

***— Нам нічога не трэба выдумляць, варта ўзяць тое, што ўжо ў свеце напрацаванае. Сёння ў мяне 287 чалавек, а хапіла б і 150, у будучым, магчыма, будзе дастаткова і пяцідзесяці. Вунь два «Джон Дзіры» зааралі ўсю зямлю гаспадаркі.***

Старшыня СВК пашкадаваў, што ў нас найбольшыя праблемы — з псіхалогіяй чалавека. Напрыклад, у Канадзе кароў шампунем мыюць і хвасты расчэсваюць драўлянымі грабеньчыкамі, а калі карова наляпала, то работнік тут жа бяжыць зграбаць, каб хоць жывёліна ў брудзе не ляжала.

І гэта праўда. Мы да такога не дараслі, бо калі ў «Малечы» каровы не такія ўжо і чыстыя, то што казаць пра іншыя гаспадаркі.

Не ўсё адразу. Хочацца спадзявацца, што і мы дажывём да гэтага.

* * *

Старшыня райвыканкама ў сваім кабінеце расказваў пра будні раёна і напомніў, што ў Бярозе будзе ўзведзены Лядовы палац, будуецца другі Храм — памяць загінулым воінам-афганцам...

Паўстала пытанне наконт медыцынскага абслугоўвання ў раёне. Ці былі закрыты ўчастковыя бальніцы? Юрый Іосіфавіч адказаў:

— Усе тыя мільярды, што застаюцца ў раёне, ідуць найперш на медыцыну, адукацыю, сацыяльныя праграмы. З 2004 года ў нас дзейнічаюць дзіцячы прытулак і дом для састарэлых, а сёлета адкрылі рэабілітацыйны цэнтр для інвалідаў — людзі атрымалі работу, туды інвалідаў возяць на машыне, яны кантактуюць паміж сабой — жыццё іх стала больш паўнацэнным. І ніводная бальніца ў раёне не зачыніла дзверы.

І добра, калі так.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**
**Фота аўтара.**
*Бярозаўскі раён.*

## ДЫРЭКТАРЫ... СУПРАЦЬ ПАДАТКАЎ

**Супрацоўнікі Наваполацкага міжраённага аддзела ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Віцебскай вобласці ўзбудзілі крымінальную справу за ўхіленне ад выплаты падаткаў у дачыненні да дырэктара мясцовай фірмы.**

Яму інкрымінуецца выкарыстанне фіктыўных дагавораў на выкананне будаўніча-мантажных работ і неабгрунтаванае пералічэнне грошай на разліковы рахунак аднаго з наваполацкіх прадпрыемстваў, тым самым завысіўшы выдаткі на вытворчасць работ. Такім чынам ухіліўся ад выплаты падаткаў на суму 50 мільёнаў беларускіх рублёў. А яшчэ больш зэканоміў на падатках другі дырэктар з Віцебска, у дачыненні да якога ўзбудзілі крымінальную справу работнікі ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці. Кіраўнік прыватнага прадпрыемства летась у падатковыя дэкларацыі ўнosіў заведама няправільныя даныя. У выніку недаплаціў у дзяржаўную казну больш за 200 мільёнаў беларускіх рублёў. Разумны вельмі?

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## СПАЛІЛІСЯ НА МЕТАЛЕ

**Прадпрымальны «дуэт» гамяльчан, якія зараблялі на метале, трапіў на «заметку» да супрацоўнікаў праваахоўных органаў.**

Мужчыны, 36 і 40 гадоў, якія нідзе не працавалі, са студзеня незаконна нарыхтоўвалі і рэалізоўвалі лом чорнага металу. На гэтай справе яны атрымалі даход у памеры 35 мільёнаў рублёў. Упраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Гомельскай вобласці ўзбуджана крымінальная справа.

**Дзімітрый СТАНКОВІЧ.**

## ТРЫМАЙ ГРОШЫ БЛІЖЭЙ ДА ЦЕЛА

**Зладзеі на рынку адчуваюць сябе прывольна, бо людзей шмат і сюды ідуць з грашыма.**

Вось прыехала жыхарка в. Дубава ў Баранавічы, каб зрабіць салідную пакупку, зазірнула ў сумачку, а 1 800 000 рублёў няма. Такія грошы носяць бліжэй да цела.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**по продаже объекта, находящегося в республиканской собственности, и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания имущества, с условиями с установлением начальной цены продажи неиспользуемого имущества равной одной базовой величине**

**Аукцион состоится 4 ноября 2008 г. в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**

**Организатор аукциона:** фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62.

**Продавец:** Республиканское унитарное производственное предприятие «Могилевхлебпром», 212009, г. Могилев, ул. Космонавтов, 39, тел. 8(0222)323053, 224775.

| № лота | Сведения о предмете аукциона | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Информация о имуществе | | | Информация о земельном участке | | |
| | Наименование | Место нахождения | Начальная цена продажи недвижимого имущества, тыс. руб. | Площадь, га | Срок аренды, лет | Начальная цена продажи права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб. |
| 1 | Не завершенное строительством капитальное строение – расширение хлебозавода (производственный корпус, административно–бытовой корпус, котельная) | Могилевская область, г. Костюковичи, ул. Колхозная, 41 | 105,0 | 1,8242 | 50 | 69 941,330 |

Начальная цена продажи предмета (лота) аукциона **70 046,330** тыс. рублей.

Сумма задатка **7 000,0** тыс. рублей.

Условия продажи имущества:

– осуществление покупателем предпринимательской деятельности на объекте недвижимости, создание им дополнительных рабочих мест;

– запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объекта недвижимости до выполнения им условий договора купли-продажи.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление АСБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050, ОКПО 28319105 фонда «Могилевоблимущество».

Полная информация об условиях участия в аукционе и порядке его проведения ранее была опубликована в газете «Звязда» 14 августа 2008 года.

Срок заключения (государственной регистрации) договора купли-продажи и договора аренды земельного участка не позднее 20 рабочих дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона.

Заявления принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день подачи заявок 31 октября 2008 г. до 17.00. С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни до установленного последнего дня подачи заявок на участие в аукционе.

**Контактные телефоны организатора аукциона: 8(0222)311185, 311216, 223375.**



## ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО» «21» ноября 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион

**по продаже объекта, находящегося в собственности Острошицкого сельского Совета, и права заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания**

**На аукционные торги выставляется предмет аукциона, включающий:**

| | |
|---|---|
| **Здание клуба** (инв. № 601/С-16498), расположенное по адресу: Минская область, Логойский район, д. Кондратовичи, 1990 года постройки, общей площадью 103,5 кв.м. Одноэтажное здание, фундамент бетонный, стены кирпичные, перегородки блочные оштукатуренные, дощатые, перекрытие деревянное, крыша шиферная, полы дощатые. Инженерные коммуникации отсутствуют. | **Право заключения договора аренды земельного участка,** площадью 0,1040 га, сроком на 99 лет, отведенного для обслуживания здания клуба. |

**Начальная цена** предмета аукциона 63 588 093 рубля (в том числе: имущество – 61 617 241 рубль и право заключения договора аренды земельного участка – 1 970 852 рубля).

**Сумма задатка** предмета аукциона 5 000 000 руб.

**Продавец недвижимого имущества:** Острошицкий сельский исполком, расположенный по адресу: Минская область, Логойский район, д. Острошицы, тел. (801774) 57636.

**Арендодатель земельного участка:** Логойский районный исполнительный комитет.

**К участию в аукционных торгах допускаются:** юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Логойским райисполкомом решения о представлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» № 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

**Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09. Последний день подачи заявок 20 ноября 2008 г. до 13.00.**


## ПЛЫЛА ПА РЭЧЦЫ ПЛЯМА...

**Яе назіралі на Дняпры ў Рагачоўскім раёне, пра што і паведамілі супрацоўнікам Жлобінскай міжрайінспекцыі.**

Дзяржінспектары сумесна з міліцыяй, прадстаўнікамі мясцовага аддзела па надзвычайных сітуацыях і работнікамі інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя хутка ўстанавілі крыніцу забруджвання — плывучы кран, які на працягу трох сутак працаваў на рацэ паблізу вёскі Свержань з няспраўным рухавіком. Лабараторныя даследаванні вады, на шчасце, нічога страшнага не выявілі. Аднак паўстала пытанне аб прыпыненні работы крана і прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці службовых асобаў за выпуск на працу тэхнічна няспраўнага плывучага крана.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Прыдумваюць, але не ўкараняюць

### Чаму хворыя каровы так і не дачакаліся новых лекаў?

**Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці прыйшлі да высновы, што распрацоўкі мясцовых вучоных у сельскагаспадарчай галіне не ўкараняюцца ў вытворчасць. У выніку сродкі, пералічаныя для вядзення навуковай работы, выкарыстоўваюцца неэфектыўна.**

Вось вельмі паказальны наступны прыклад. Віцебскай дзяржаўнай ордэна «Знак пашаны» Акадэміі ветэрынарнай медыцыны трэба было распрацаваць лекі для лячэння эндаметрыту ў кароў і арганізаваць вытворчасць на базе Інстытута тэхнічнай акустыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Бюджэтныя сродкі праекта — больш за 130 мільёнаў рублёў.

Кантралёры ўстанавілі, што гэтыя вялікія грошы патрачаны неэфектыўна, бо вытворчасць прэпарата так і не наладжана.

Як высветлілася, вытворчасць немагчыма наладзіць на базе Інстытута акустыкі, бо там адсутнічаюць памяшканні, якія адпавядаюць патрабаванням санітарных нормаў.

Камісіяй па ветэрынарных прэпаратах Беларускага дзяржаўнага ветэрынарнага цэнтра рэкамендавана ветэрынарнай акадэміі разгледзець пытанне аб перадачы для рэгістрацыі навукова-тэхнічнай дакументацыі на ветэрынарны прэпарат «Эрыметрын» для наступнай яе вытворчасці на прадпрыемства «Віцебская біяфабрыка».

Тэхнічныя ўмовы на прэпарат ва ўстаноўленыя тэрміны не былі ўзгоднены з Беларускім дзяржаўным ветэрынарным цэнтрам, так як прэпарат, выраблены ў верасні мінулага года, не вытрымаў выпрабаванняў...

Толькі ў ходзе праверкі дакументацыя на прэпарат была разгледжана на спецыяльным савеце пры галоўным упраўленні ветэрынарыі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, і прэпарат рэкамендаваны для рэгістрацыі. Да гэтага ён не выпрабляўся. Разам з тым акт прыёмкі навуковых даследчых работ па гэтым заданні падпісаны прыёмачнай камісіяй пад старшынствам першага намесніка старшыні аблсельгасхарчу і зацверджаны напрыканцы мінулага года першым намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама, згодна з якім заданне выканана ў поўным аб'ёме ў адпаведнасці з тэхнічным заданнем. Хворым каровам, на жаль, ад гэтых паперак не лягчэй.

Матэрыялы праверкі разгледжаны на калегіі Камітэта дзяржкантролю. Кіраўнікам правераных устаноў указалі на тое, што яшчэ ёсць час укараніць навуковыя распрацоўкі ў вытворчасць, што дазволіць гаварыць пра эфектыўнасць...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**У суд Бабруйскага раёна і г. Бабруйска** паступіла заява аб прызнанні памерлай грамадзянкі **Кульша Пелагеі Пракопаўны** 1932 года нараджэння, ураджэнкі г. Бабруйска, апошняе вядомае месца жыхарства — г. Бабруйск, вул. Чапаева, д. 48. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзянку Кульша Пелагею Пракопаўну, паведаміць іх суду Бабруйскага раёна і г. Бабруйска на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**Суд Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці** просіць грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі аб фактычным месцы знаходжання **Сяргеенкавай Святланы Пятроўны** 1971 года нараджэння, ураджэнкі вёскі Дразды Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства і месца знаходжання — в. Дразды Лёзненскага раёна Віцебскай вобл., паведаміць іх суду па адрасе: 211200, Віцебская вобл., г.п. Лёзна, вул. Леніна, дом 100-а, на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**У суд Клецкага раёна Мінскай вобласці** паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **Халецкага Івана Васільевіча**, 25 ліпеня 1975 года нараджэння, ураджэнца с. Вострaў, Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобл., які пражываў у вёсцы Карацк па вул. Партызанская, д. 55, Клецкага раёна Мінскай вобл., апошняя вядомыя дата і месца знаходжання — сакавік 2005 года, с. Вострaў Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобл. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Халецкага І.В., паведаміць іх суду Клецкага раёна (г. Клецк, вул. Панкратаўская, 6, Мінская вобласць, тэл. 8 01793 53 591) на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

**Считать недействительным страховой полис серии АЖ № 3067547** по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ «Белкоопстрах».

**Утерянные представительством № 3 по г. Минску Белгосстраха** бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу серии БЛ № 494994—494995, **считать недействительными**.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.49 | 17.58 | 10.09 |
| Віцебск — | 7.42 | 17.45 | 10.03 |
| Магілёў — | 7.39 | 17.49 | 10.10 |
| Гомель — | 7.33 | 17.48 | 10.15 |
| Гродна — | 8.04 | 18.14 | 10.10 |
| Брэст — | 8.01 | 18.18 | 10.17 |

**Месяц**

*Апошняя квадра. Месяц у сузор'і Льва.*

**Імяніны**

*Пр. Марыі, Надзеі, Пелагеі, Тацяны, Таісіі, Васіля, Дзмітрыя, Паўла, Пахома, Пятра, Трыфана.*
*К. Урсулы, Гіляра, Якуба.*

## НАДВОР'Е на заўтра

Віцебск 749мм рт.сл. +6..+8°C +13..+15°C
Гродна 750мм рт.сл. +7..+9°C +14..+16°C
Мінск 747мм рт.сл. +6..+8°C +13..+15°C
Магілёў 749мм рт.сл. +5..+7°C +12..+14°C
Брэст 749мм рт.сл. +7..+9°C +15..+17°C
Гомель 754мм рт.сл. +5..+7°C +13..+15°C

Геамагнітныя ўзрушэнні: 0 гадз., 03 гадз., 06 гадз., 09 гадз., 12 гадз., 15 гадз., 18 гадз., 21 гадз.

Абазначэнні: — няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў; — невялікія геамагнітныя ўзрушэнні; — слабая геамагнітная бура

...у суседзяў

Варшава +14..+16°C
Вільнюс +11..+13°C
Кіеў +14..+16°C
Масква +10..+12°C
Рыга +10..+12°C
С.-Пецярбург +8..+10°C

## Усміхнёмся!

**На рэчавым рынку:**
**— Дарагі, купляй дублёнку! Мамай клянуся, скура маладога дэрмаціна!**

☺

**— Вой, Клава, глядзі! Якое ў вас у агародзе натуральнае пудзіла!**
**— Нахабнік! Гэта мая мама!**

☺

Учора на МКС касманаўты адзначалі дзень нараджэння амерыканскага калегі, а таксама здзейснілі тры выхады ў адкрыты космас. Два разы пакурыць, і адзін раз растлумачылі калегу, хто на МКС галоўны.

☺

**— Дзеці мае! Я паміраю, прынясіце мне шклянку вады...**
**— Бацька, 1 студзеня ўсе паміраюць, вазьмі і сам прынясі!**

☺

Гэтую істэрыку я прысвячаю табе, каханы...




# У імя роўнаапостальнага князя Уладзіміра

1020 ГОДЗЕ ХРЫШЧЭННЯ РУСІ 2008

За ўсё існаванне вуліцы 1-й Пасялковай (яна здаўна гублялася сярод такіх жа маленькіх вулак мінскай ускраіны) тут ніколі не было так шматлюдна. Мінчане і госці з блізкіх мясцінаў сабраліся сюды, каб папрысутнічаць на ўрачыстасці асвячэння новага праваслаўнага храма ў гонар роўнаапостальнага князя Уладзіміра. Усе яны з кветкамі сустракалі Мітрапаліта Філарэта. Кіраўнік Беларускай праваслаўнай царквы адслужыў тут Боскую літургію. Новая царква з'явілася на месцы невялічкага старога жылога будынка, які доўгі час не знаходзіў дбайных гаспадароў.







Пасля нязначнай рэканструкцыі і дабудовы традыцыйных храмавых элементаў абрысы царквы праступілі ва ўсёй прыгажосці. І няхай яшчэ не ўсе будаўнічыя работы завершаны, не ўся прылеглая тэрыторыя добраўпарадкавана (усё гэта супольнай працай яшчэ будзе зроблена) — у асвечаным храме гучыць малітва за спакой і дабрабыт, азораная імем Святога Уладзіміра-хрысціцеля.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

## Іронія як сродак лекавання

У Год здароўя на Першым канале як ніколі многа медыцынскай тэматыкі. З 20 кастрычніка пачаўся самы рэйтынгавы серыял пра медыцыну — «Доктар Хаўс» (ЗША). Гісторыя пра геніяльнага ўрача-дыягноста Грэгары Хаўса, які, нягледзячы на складаны характар — лепшы ў сваёй галіне, атрымала некалькі прэстыжных кінаўзнагарод, а выканаўца галоўнай ролі акцёр Х'ю Лоры быў адзначаны двума «Залатымі глобусамі» і трыма намінацыямі на «Эмі».

«Доктар Хаўс» — гэта не сучасная камедыя, а хутчэй іранічны дэтэктыў, і многія прыхільнікі серыялу невыпадкова адзначылі, што персанаж доктара Хаўса блізкі да Шэрлака Холмса — бліскучы розум, універсальны спецыяліст, мае адзінага сябра доктара Уілсана і жыве ў доме 221б. Толькі змагаецца ён не са злачынцамі, а з недасканаласцю свету. І толькі такі герой — непаліткарэктны, замкнёны, рэзкі і цынічны, часам, здаецца, нават жорсткі — у канечным выніку перамагае хваробы па ўсіх пунктах...

Як паведамляе прэс-служба БТРК, беларускім гледачам будуць прапанаваныя ўсе чатыры сезоны серыялу — па буднях у вячэрнім эфіры, з паўторам раніцай.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## 21 кастрычніка

*Дзве даты*

**1878 год** — 130 гадоў таму нарадзіўся Уладзімір Іванавіч Пічэта, вядомы беларускі гісторык, акадэмік НАН Беларусі (1928), АН СССР (1946), адзін з арганізатараў і першы рэктар Белдзяржуніверсітэта (1921—1929 гг.). У 1930-м, падчас першай хвалі рэпрэсій, асуджаны да высылкі на 5 гадоў і пазбаўлены звання акадэміка, якое было аднoўлена толькі ў 1940 годзе, цалкам рэабілітаваны ў 1967 годзе. Аўтар больш як 500 навуковых прац, якія ў большасці сваёй прысвечаны гісторыі Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны, а таксама манаграм па гісторыі права. Выдзеліў гісторыю дзяржавы і права ў самастойную навуковую дысцыпліну ў беларускай гістарычнай навуцы. Памёр у 1947 годзе.



**1894 год** — на прастол узышоў Мікалай II, апошні расійскі імператар.

*Цытата дня:*

***«Веды — гэта тое, што найбольш істотным чынам узвышае аднаго чалавека над другім».***

**Джозеф Адысан (1672—1719), англійскі пісьменнік.**

# ДРОВЫ

Свет і сусвет чалавека

**Дровы — ссечаныя і распілаваныя часткі дрэваў, якія выкарыстоўвалі для таго, каб паліць у печы і саграваць хату.**

● Нарыхтоўкай дроў, звычайна, займаліся мужчыны. Лічылася, што той, хто накіраваўся ў лес па дровы на зіму, раней за іншых раніцай трапіў у лес і ссек першае дрэва, у таго «жыццё будзе цяплейшым і багацейшым».

● Час, на працягу якога займаліся нарыхтоўкай дроў, у народзе называлі дрывасекам. Пачыналіся «дрывасечныя тыдні» ў сакавіку-красавіку, а заканчваліся на Якава-дрывасека — ахоўніка дрывасекаў (22 кастрычніка).

● У некаторых мясцовасцях дровы нарыхтоўвалі талакой: у адзін дзень нарыхтоўвалі дровы для адной хаты, у другі — для другой, і так для ўсёй вёскі. Не забываліся і пра тыя падворкі, дзе жылі ўдовы і сіроты: «На ўдовіны двор хоць шчэпку кінь».

● На працягу года былі дні, калі забаранялася займацца нарыхтоўкай дроў: на Каляды, на Саракі, у перадвелікодную пятніцу, у чацвер на Траецкім тыдні, у Градавую сераду, у нядзелю і святочныя дні.

● Забаранялася секчы дровы пасля захаду сонца.

● Дровы раілі нарыхтоўваць на збыта; дровы, нарыхтаваныя на поўню, хутка пагніюць.

● Забаранялася калоць дровы ці складваць іх на парозе хаты. Лічылася, што непаважлівыя адносіны да продкаў выклікаюць хваробу ці смерць сваякоў.

● На дровы бралі не ўсе дрэвы. Катэгарычна забаранялася секчы рабіну, бузіну, асіну, шыпшыну, вішню, а таксама дрэва, у якое трапіла маланка ці якое было вывернута з коранем у час буры. Лічылася, што парушэнне гэтай забароны выклікае хваробу ці смерць кагосьці з жыхароў гэтай хаты.

● Месца, дзе секлі і захоўвалі дровы, лічылася «нячыстым», таму імкнуліся не заходзіць туды ўначы. У той жа час рытуальныя дзеянні лячэбнай магіі выконвалі менавіта ў такім месцы. Напрыклад, на Каляды дзяўчаты наўздагад хапалі дровы і неслі ў хату, дзе пералічвалі іх: цотная колькасць дроў прадказвала хуткае вяселле.

● Цяжарнай жанчыне неабходна было асабліва пільна выконваць правілы, звязаныя з дровамі, і пазбягаць месцаў, дзе пілуюць і сякуць дровы, каб дзіця не нарадзілася з рассечанымі вуснамі.

● Калі вы памянялі месца жыхарства, то сярод рэчаў, якія першымі ўносіце ў новую хату, павінны быць і дровы са старога падворка. Першы раз печ у новай хаце распальвалі менавіта гэтымі дровамі.

● Для лазні жаніху і нявесце перад вяселлем нарыхтоўвалі спецыяльныя дровы — з сасны і кедру.

● Часам на вяселлі, сярод іншых выпрабаванняў, жаніха прасілі пакалоць дровы, каб той паказаў сваю спрытнасць і гаспадарлівасць.

● Па тым, як дровы гарэлі ў печы, прадказвалі надвор'е: гараць з трэскам — будуць маразы; дрэнна распальваюцца, шыпяць, дымяць — чакай адлігі.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

*Дарагога і любага сыночка **Івана Васільевіча МІХАЙЛОЎСКАГА** з г. Мінска віншую з днём нараджэння. Жадаю цяпла, дабра, моцнага здароўя на доўгія гады.*
***Мама, в. Такаўшчына.***

# ПАЛОННІКІ МАТРЫЦЫ, або Што нясе эпоха Вадалея




*Прачніся, Нэа! Час выйсці з МАТРЫЦЫ*

**Днём ён законапаслухмяны грамадзянін містэр Андэрсан, праграміст у буйной амерыканскай кампаніі, а ноччу — хакер Нэа, які блукае па сусветным павуцінні ў пошуках АДКАЗАЎ. Цяжка сказаць, у які дакладна момант містэра Андэрсана перастала задавальняць яго камфортнае сытае жыццё, з культам поспеху і зялёных банкнот, аднак гэта надарылася і з той пары яго не пакідала адчуванне няправільнасці, нерэальнасці таго, што мы прывыклі лічыць рэчаіснасцю. А ў вас не ўзнікае падобнага адчування?**

### Свабода выбару

— Жыццё звычайнага чалавека вельмі канкрэтнае, яго думкі не выходзяць за межы паўсядзённых рэчаў і праблем (паесці, паспаць, зарабіць грошай на пральную машыну і г.д.), у адпаведнасці з тэасофскай канцэпцыяй я называю гэта «канкрэтны ментал», — расказвае **кіраўнік аддзела па даследаванні працэсаў планетарнага сінтэзу Інстытута гуманітарных і экалагічных тэхналогій НАН Беларусі, магістр філасофскіх навук Мікалай ПАНЧЫШЫН**. — Канкрэтны ментал — гэта сукупнасць нашых пажыццёвых думак (аб быце, паўсядзённых справах і г.д.). Вельмі часта свядомасць чалавека абарачаецца менавіта ў гэтым канкрэтным ментальным полі, і ён не задаецца філасофскімі пытаннямі сэнсу жыцця і ўласнага прызначэння. Аднак на пэўным этапе гэты ўзровень існавання перастае яго задавальняць. Калі ў жыцці ўзнікаюць праблемы — са здароўем, кар'ерай, фінансамі, — чалавек пачынае задумвацца: чаму так адбываецца? У гэты момант у яго ўзнікае ўнутраная патрэба высветліць, хто ён, для чаго жыве на гэтай зямлі? Як толькі чалавек у гэта паглыбляецца, ён пачынае ўсведамляць сябе боскай існасцю, яго інтарэсы пашыраюцца, выходзяць за межы выключна бытавых. Чалавек імкнецца зразумець свет і сваё месца ў ім. На першы план выходзіць духоўнасць. Калі пры гэтым чалавек прыходзіць да высновы, што ўвесь час жыў няправільна, не па касмічных законах, яго пачынае турбаваць адчуванне ўласнай недасканаласці (можна сказаць, што чалавек ПРАЧЫНАЕЦЦА). Працэс гэты даволі балючы. Не кожны здольны яго вытрымаць. Некаторыя на гэтым этапе адмаўляюцца ад сваіх філасофскіх пошукаў, свядома засяроджваюцца на «жыцці цела», вяртаюцца ў рэчышча канкрэтнага менталу і зноў «засынаюць». А іншыя працягваюць шукаць АДКАЗЫ і духоўнае прасвятленне. Свет бытавога (канкрэтнага) менталу — гэта свет татальнай несвабоды, альбо МАТРЫЦЫ, дзе чалавек жыве не сваімі, а запазычанымі ідэямі.

Паводле трактоўкі Мікалая Васільевіча, МАТРЫЦА — гэта свет фальшывых ідэй, памылковых памкненняў, эгаістычных мэтаў, якія навязваюцца чалавеку і трымаюць яго ў пастаянным страху. МАТРЫЦА — гэта інфармацыйнае поле, у якім няма дакладна вызначанага ўсведамлення чалавека сябе як асобы, а ёсць толькі рэпрадукцыя стэрэатыпаў; поле, дзе ёсць розум, але не прысутнічае крытычны аналіз. МАТРЫЦА ўзнікла тады, калі з'явіўся «чалавек разумны», чыю ментальную энергію цёмныя сілы навучыліся выкарыстоўваць у сваіх мэтах.

— Калі гаварыць пра структуру Сусвету, — працягвае філосаф, — трэба адзначыць, што ёсць свет праяўлены (матэрыяльны, ці свет рэчаў, як называў яго Платон) і непраяўлены (наасфера, свет ідэй). Прычым апошні падзяляецца на пазітыўны (БОСКАЯ СІЛА, СВЕТ ДУХАЎ, АБСАЛЮТ) і негатыўны (цёмныя сілы), паміж якімі знаходзіцца «канкрэтны ментал» (наша рэчаіснасць, МАТРЫЦА). Наасферу можна параўнаць з інтэрнэтам, дзё ёсць і дабро, і зло. Першапачаткова чалавецтва было створана ў СВЯТЛЕ і сутыкненне са злом — гэта звычайны метад нашага духоўнага навучання.

Раней людзі верылі, што Зямля плоская. Потым, што яна — цэнтр Сусвету. Прыкладаў памылковых перакананняў чалавецтва можна прывесці шмат. А тлумачэнне гэтаму простае: МАТРЫЦА (свет устаноўленых стэрэатыпаў) — ГЭТА ІЛЮЗІЯ. І так будзе да той пары, пакуль чалавек не з'яднаецца са сваім вышэйшым «я», не знойдзе свет сваіх духоўных перажыванняў, не выйдзе з МАТРЫЦЫ. Задача цёмных сілаў — перашкодзіць яму гэта зрабіць, СВЕТЛЫХ — дапамагчы. Выбар робіць сам чалавек.

МАТРЫЦУ будуюць цёмныя сілы, для іх яна — крыніца энергіі. Яны зацікаўленыя ў нагнятанні негатыву (праз СМІ, палітыкаў), бо менавіта негатыў (страх, насілле) дае ўладу маніпуляваць людзьмі. А СВЕТ ДУХАЎ пабудаваны выключна на добраахвотным жаданні, на свабодзе выбару. Без усвядомленага шчырага жадання чалавека стаць лепшым дапамагчы яму немагчыма.

— Менавіта па гэтай прычыне пакуль толькі асобныя адзінкі могуць прарывацца праз заслону негатыўных думкаформаў, што навязваюцца нам МАТРЫЦАЙ. Трэба мець шмат унутранай энергіі, каб насуперак сацыяльнаму ўціску застацца чалавекам.

Першы этап выхаду з МАТРЫЦЫ — развіццё крытычнага мыслення, аналіз і фільтрацыя інфармацыі. Аднак калі чалавек «застрае» ў крытычным мысленні, ён становіцца цынікам і не можа ўзняцца вышэй, а калі працягвае духоўна ўдасканальвацца, то пачынае адчуваць БОГА ў душы, прысутнасць БОГА ў сваім жыцці. У чалавека змяняецца энергетыка, здароўе, мысленне, успрыманне свету ў цэлым, усё яго жыццё. А галоўнае — ён знаходзіць мэту, духоўны арыенцір.

— Для соцыума працуе такая ж схема, што і для асобы. Соцыум павінен выйсці за межы «канкрэтнага менталу» і задумацца: для чаго жыве цэлы народ, у чым яго касмічная задача? Народу неабходна стварыць новую парадыгму. Як толькі ў народа з'яўляецца мэта, нацыянальная ідэя, ён становіцца згуртаваным, аб'яднаным, звяртаецца да духоўнасці. Духоўнасць, БОГА — павінен адкрыць для сябе і асобны чалавек, і цэлы народ. Як толькі гэта здараецца, узнікае ўнутранае адчуванне правільнасці абранага шляху. У адваротным выпадку ў асобнага чалавека і ў народа ў цэлым губляецца сэнс жыцця.

### Экзамен для чалавецтва

З 2003 года пачалася эпоха ВАДАЛЕЯ, якая змяніла эпоху РЫБАЎ. Кожная эпоха доўжыцца каля 2160 гадоў. Столькі ж працягнецца і эпоха ВАДАЛЕЯ. Пры змене эпох заўсёды назіраецца «эфект вадаспаду».

**У бліжэйшыя гады варта чакаць эканамічных і палітычных крызісаў. Аднак разам з тым — і вялікіх станоўчых перамен, у першую чаргу ў галіне адукацыі і сацыяльнага ўладкавання.**

— Агульны паток чалавецтва можна параўнаць з ракой, якая рухаецца ў рэчышчы часу, а ў пераходны перыяд (пры змене эпох) ненадоўга завісае ў «свабодным палёце», якраз перад тым, як абрынуцца ў бездань вадаспадам. Пры гэтым асобныя «кроплі» (чалавечыя існасці) пачынаюць узнімацца ўверх, дзе знаходзіцца новы свет, новы ўклад жыцця, далейшае духоўнае развіццё. Згодна з многімі прароцтвамі, календарамі мая і іншых старажытных народаў, для нас пераходны перыяд пачаўся дзесьці з 1975 года і будзе доўжыцца да 2012-га, калі працэс выхаду на новую рэчаіснасць (мы яе называем інфармацыйным грамадствам) завершыцца. Вось на гэтым памежжы — з 1975 па 2012 год — кожны чалавек павінен зрабіць свой выбар — куды ён хоча накіравацца (узняцца ўверх, ці апусціцца ў негатыў). Ад гэтага выбару будзе залежаць яго далейшае жыццё.

Паводле слоў Мікалая Васільевіча, пераходны перыяд — зручны момант, каб праявіць чалавека, яго ўнутраны свет. Гэта як здача экзаменаў, своеасаблівая сесія, дзе кожны павінен прадэманстраваць выніку сваёй духоўнай работы. У пераходны перыяд узнікае эфект, які Панчышын называе ЭНЕРГАСАЦЫЯЛЬНЫМ КЛЕЕМ. Гэта вязкая адмоўна зараджаная і вельмі заразная субстанцыя, якая зацягвае ў сваё поле людзей з негатыўнымі жыццёвымі ўстаноўкамі.

— Увогуле, негатыў — гэта вельмі заразная вібрацыя, якая ў апошнія гады набыла маштабы сапраўднай эпідэміі, — гаворыць Мікалай Панчышын. — Калі чалавек з негатыўнай вібрацыяй знаходзіцца ў вашым полі, ён — свядома ці неўсвядомлена — скідвае частку адмоўнай інфармацыі на вас. Абараніцца ад заражэння вельмі складана (адсюль дэпрэсіі, расчараванні і г.д.), аднак менавіта ў гэтым і заключаецца сутнасць выбару, які прапануе чалавеку Сусвет, каб праверыць унутраную духоўную сілу кожнага і здольнасць паводзіць сябе дастойна ў цяжкіх сітуацыях.

### Наасферная канцэпцыя

У пераходны перыяд людзі губляюць глебу пад нагамі, пачынаюць «вязнуць» у негатыве (звярніце ўвагу на сусветны фінансавы крызіс — гэта першая ластаўка). «Глеба» — гэта стабільная праца, стабільная сям'я, стабільныя адносіны... І раптам усё гэта знікае, распадаецца. Цёмныя сілы пераконваюць, што ў жыцці не засталося нічога добрага. І многія вераць, апускаюцца ў негатыў, духоўна дэградуюць. Вось чаму філосафы сёння — самыя галоўныя людзі. Іх роля і практычная карысць велізарныя.

— Яны павінны даць людзям правільныя арыенціры, нагадаць, што не залатому цяльцу трэба пакланяцца, а шукаць БОГА, сваім уласным прыкладам паказаць, ЯК трэба жыць. Дрэнны той філосаф, які толькі паўтарае завучаныя фразы. Сапраўдная філасофская ідэя «запальвае» людзей, як пажар стэпавую траву. Яе носьбіт АБАВЯЗАНЫ на практыцы прытрымлівацца прынцыпаў, якія прапаведуе. Ён павінен спачатку адкрыць БОГА ў сабе і толькі потым дарыць гэтыя веды іншым. Тады ў людзей складзецца агульнае бачанне сацыяльных працэсаў, што назіраюцца сёння ў грамадстве, цэласная карціна свету. Такая парадыгма цяпер ствараецца, умоўна яе можна назваць «наасфернай канцэпцыяй чалавецтва».

Эпоха РЫБАЎ вызначалася ідэалізмам, верай у аўтарытэты, безумоўным падпарадкаваннем настаўніку, майстру, гуру. У эпоху ВАДАЛЕЯ чалавек становіцца самадастатковым, ён цяпер сам сабе настаўнік і гуру. Новая эпоха характарызуецца высокай ступенню свабоды грамадства, высокім узроўнем самаарганізацыі сацыяльнай сістэмы, адчуваннем БОГА ў сабе. Зноў становяцца запатрабаванымі маральныя запаведзі, змешчаныя ва ўсіх сусветных рэлігійных кодэксах. Ужо сёння ўсё больш і больш людзей пачынаюць разумець, што будаваць сацыяльныя і міжасабовыя адносіны трэба на аснове прынцыпу ўзаемнай павагі, альбо, як вызначаюць яго еўрапейцы, прынцыпе «mutural respect».

— З яго ўкараненнем у соцыум і ў свядомасць кожнага чалавека знікнуць прычыны для канфліктаў, тэрарызм, рэлігійныя войны. Між іншым, гэты прынцып можна смела назваць квінтэсэнцыяй эпохі ВАДАЛЕЯ, бо грамадства эпохі ВАДАЛЕЯ — гэта грамадства свабодных людзей, якія паважаюць адзін аднаго. Гэта аснова канцэпцыі «гражданского общества».

### «Быць» ці... «мець»?

Напрыканцы размовы мой суразмоўца нагадаў, што кожны з нас знаходзіцца на сваім індывідуальным узроўні духоўнага развіцця. І чым гэты ўзровень ніжэйшы, тым лягчэй намі кіраваць МАТРЫЦЫ.

— Трэба нарэшце перастаць жыць па прынцыпе «МЕЦЬ» і пачаць укараняць прынцып «БЫЦЬ» (гэта схема, прапанаваная Эрыхам Фромам). Калі мы ідзём па шляху «БЫЦЬ», мы маем безасабовы матыў, бескарысліва аддаём, нічога не патрабуем узамен, вызваляемся ад негатыву і прыходзім да БОГА. А калі жыць па прынцыпе «МЕЦЬ», імкнуцца браць (нават незаконна), спажываць усё больш і больш — мы будзем пакутаваць. Трэба разумець галоўны касмічны закон: ЛЮБЫ ЗРОБЛЕНЫ ТАБОЙ НЕГАТЫЎ АБАВЯЗКОВА ТАБЕ ВЕРНЕЦЦА. Жыццё — гэта люстэрка, якое вяртае кожнаму тое, што ён дэманструе свету.

Цяпер праходзіць вельмі адказны для чалавецтва перыяд, які нясе нам шмат выпрабаванняў. Паводле прагнозаў Панчышына, у бліжэйшыя гады варта чакаць эканамічных і палітычных крызісаў. Аднак разам з тым — і вялікіх станоўчых перамен, у першую чаргу ў галіне адукацыі і сацыяльнага ўладкавання.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

«МТС — аграгарадкам»

# І БУДЗЕ СВЯТА Ў ПАСТАВАХ

Сумная восень з дажджамі. Часам успамінаеш нешта прыемнае, плануеш, куды адправіцца, калі вернецца цяпло.

Паставы — адзін з самых прыгожых гарадоў нашай краіны. Цяпер ён актыўна рыхтуецца да свайго знакавага юбілею, які адбудзецца налета, — 600-годдзя з моманту першага ўзгадвання ў гістарычнай літаратуры вёскі Пасаднік, што з часам і ператварылася ў Паставы.

Супрацоўнікі кампаніі МТС ужо зрабілі шмат для таго, каб увесь Пастаўскі раён быў добра «мабілізаваны», каб усюды абаненты МТС заставаліся на сувязі. Дзякуючы МТС, «мабільнымі» будзе зручна зрабіцца і іншаземцам, якіх у гэтым прыгранічным горадзе заўсёды бывае нямала. Шмат гасцей будзе і на святкаванні — запрасілі дэлегацыі з Італіі, Польшчы, Расіі, прыбалтыйскіх рэспублік.

На працягу святочных чэрвеньскіх дзён у Паставах пройдзе традыцыйны фестываль «Звіняць цымбалы і гармонік». Будзе арганізавана фотавыстава, прысвечаная Паставам. Як і было задумана некалькі гадоў таму, улады горада адкрыюць помнік народным музыкантам.



На мой погляд, адно з самых цікавых месцаў у Паставах — палац Тызенгаўзаў. Цяпер вядуцца работы па далейшым вывучэнні і рамонце падземных памяшканняў палаца. Музейную экспазіцыю мяркуюць адкрыць у цокальным паверсе побач са стыльным кафэ. І тое, што старажытны палац у нашы дні — месца, дзе знаходзіцца частка раённай бальніцы, зусім не перашкаджае энтузіястам, якія займаюцца рэстаўрацыяй. Безумоўна, пастаўская бальніца — з'ява ўнікальная не толькі для Беларусі. Няшмат у свеце месцаў, дзе ў старажытным будынку спалучаюцца гістарычнае мінулае і медыцына XXI стагоддзя з поўнасцю камп'ютарызаванай сістэмай абслугоўвання пацыентаў. А дзе яшчэ вы ўбачыце, каб пры ўваходзе ў медыцынскую ўстанову падчас святочных дзён іграў сапраўдны сімфанічны аркестр (*на фота*), каб у добра ўпрыгожаным парку вас сустракалі гэткія дзіўныя скульптуры?.. Толькі тут!



А як прыемна ўвечары пагуляць па гістарычным цэнтры! Паглядзець на дамы, дзе калісьці жылі майстры. Добра, што разам з цэнтрам горада стараюцца прывесці ў парадак і ўскраіны. Жыхары самастойна ўпрыгожваюць свае балконы, двары, прыватныя дамы. Усе працуюць, каб родны горад стаў яшчэ больш прывабным, непаўторным. Такія яны — пастаўчане!

Кампанія МТС дапамагае ўсім абанентам не забываць старых сяброў і знаходзіць новых. Заставайцеся з МТС і парайце тым, хто яшчэ не падключыўся да найбуйнейшай сотавай сеткі краіны, хутчэй далучыцца да апаратара сувязі. Яны не пашкадуюць. Асабліва калі наперадзе — новыя падарожжы па родным краі.

**Вядучы рубрыкі Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.**

## «Паліцэйскі разварот» у дождж, або Гонкі ў цэнтры Мінска

У нядзелю, 19 кастрычніка, у сталіцы каля стэлы «Мінск—горад-герой» адбыўся фінал акцыі «Спартсмены — за бяспеку дарожнага руху», якая праводзілася ў рамках чэмпіянату Беларусі па хуткасным манеўраванні. На фінальныя старты выйшлі не толькі мінчане, але і прадстаўнікі Брэста. Стартавала акцыя 26 жніўня ў Гомелі, а затым эстафету прынялі Магілёў, Віцебск, Брэст, Гродна. Фінал прымеркаваны да Дня аўтамабіліста і дарожніка. Арганізатарамі акцыі выступілі Беларуская аўтамабільная федэрацыя, упраўленне ДАІ МУС Беларусі, ДАСААФ і газета «Аўтадайджэст».





Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.350 Індэкс 63850. Зак. № 5800. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12